№ 38 (636) 14 кастрычніка 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



Беларусі пагражае банкаўскі крызіс Старонка 2

«Кантрольная фішка» перапісу Старонка 2

Залатое дно Еўропы Старонка 8

## У НУМАРЫ

**Падазроны падрад на рэстаўрацыю гродзенскіх замкаў**

можа атрымаць прыватная фірма «Еўрапрэстыж». **Старонка 6.**

**Засталося толькі загаварыць**

Сацыялагічнае даследаванне «Новака» выявіла кансалідацыю нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. **Старонка 7.**

**Галерэя «Ў»**

Наватарская Галерэя сучаснага мастацтва адчынілася ў пункце прыёму шклатары. **Старонка 11.**

**Чалавек, якога не было**

45 гадоў таму знялі Хрушчова — недаацэненую фігуру ў савецкай гісторыі. Піша Віталь Тарас. **Старонка 13.**

**Граф вярнуўся**

Выстава фота Бенедыкта Тышкевіча ў Мінску — трэцяя ў гісторыі. Пасля Парыжа і Вільні. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Беларусаў перасадзяць на «Жыгулі»

**З 2010 года размытненне іншамарак можа падаражэць у пяць разоў.**

На 27 лістапада запланавана падпісанне ў Мінску новага кодэкса Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. Гэта яшчэ адзін крок да «групавога» ўступлення краін ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. І калі перспектыва далучэння да сусветнай гаспадарчай супольнасці застаецца замглёная, дык вынікі прыняцця агульнага з Казахстанам і Расіяй мытнага кодэкса для беларусаў могуць быць вельмі адчувальнымі.

Найперш — значна вырастуць мыты на ўвоз патрыманых аўто з-за мяжы. Сёння ў Беларусі яны вагаюцца ў межах ад 0,35 да 2 еўра за кубічны сантыметр аб'ёму рухавіка. Найбольшае мыта бярэцца за машыну, старэйшую за 14 гадоў. Але такая катэгорыя рэдкая. Большасць патрыманых машын, што ўвозяцца ў нашу краіну, маюць узрост ад трох да дзесяці гадоў. А гэта адпаведна мыта ў памеры ад 0,35 да 0,6 еўра.

А цяпер адчуйце розніцу: у Расіі ўвоз трох-пяцігадовага аўтамабіля абкладаецца мытам ад 1,2 да 2,8 еўра. А калі ўзрост аўтамабіля больш за пяць гадоў, памер пошліны сягае 6 еўра за «кубік».



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Мыта за ўвезены ў Беларусь папулярны VW Golf 2001 года з рухавіком 1800 куб. см складзе трошкі больш за тысячу еўра. У Расіі за такую трэба заплаціць у пяць разоў болей. У выпадку фіналізацыі Мытнага саюза Беларусь вымушана будзе перайсці на расійскія нормы.**

То бок мыта за ўвезены ў Беларусь папулярны VW Golf 2001 года з рухавіком 1800 куб. см складзе трошкі больш за тысячу еўра, а ў Расіі давядзецца заплаціць у казну ў пяць разоў болей. Няцяжка падлічыць, як зменяцца цэны на беларускім рынку патрыманых аўтамабіляў.

Пратэкцыяністыцкія крокі расійскага ўрада зразумелыя. Там хапае сваіх вытворцаў аўтамабіляў. У Беларусі вытворчасць легкавікоў адсутнічае, калі не лічыць іранскіх скакуноў-«Самандаў». Зразумела, што па ўніфікацыі мытнай сістэмы на беларускі рынак будуць бясспынна ўвозіцца новыя «Фальксвагены» і «Таёты», сабраныя ў Расіі. Аднак, як шмат беларусаў змогуць сабе дазволіць новы аўтамабіль замест патрыманага?

Працяг на старонцы 3.





Семдзесят гадоў таму ў вёсцы Ваўкавічы пад Навагрудкам камуністы закатавалі праваслаўнага святара, пакуль мясцовыя жыхары адседжваліся па хатах. Сёння іх нашчадкі зладзілі свой суд над камунізмам. Піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 4.**

# Памілаванне без суда і следства

**Мінюст распрацоўвае папраўку, якая дазволіць Лукашэнку спыняць крымінальныя справы.**

Такую навіну паведаміў міністр юстыцыі Віктар Галаванаў. Ён заявіў, што міністэрства распрацоўвае папраўку да крымінальнага заканадаўства, якая дасць магчымасць прыпыняць крымінальную справу, калі грамадзянін, супраць якога яна была заведзеная, звярнуўся з хадайніцтвам да прэзідэнта. Справа мае прыпыняцца да часу, пакуль зварот не будзе разгледжаны кіраўніком дзяржавы.

У які артыкул КК збіраюцца ўнесці папраўку, Галаванаў не агучыў. Гэта можа быць, напрыклад, арт. 88, які прадугледжвае вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў выпадку дзейснага раскаяння і кампенсацыі нанесенай шкоды.

Аднак такая працэдура супярэчыць Канстытуцыі. У арт. 26 гаворыцца, што «ніхто не можа быць прызнаным вінаватым у злачынстве, пакуль яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказаная і ўстаноўленая выракам суда, які ўступіў у законную сілу». Такім чынам, Лукашэнка забірае ў судоў права чыніць правасуддзе.

На дадзены момант у яго ёсць права памілавання. Ён можа памілаваць чалавека, які звярнуўся да яго з хадайніцтвам. Але толькі пасля (!) таго, як адбудзецца суд.

Працяг на старонцы 3.

**«Следчым гэта норма развяжа рукі», — мяркуе юрыстка Тамара Сяргей.**

На першы погляд — гэта як быццам бы дабро. Абвінавачаны можа кампенсаваць шкоду і застацца на свабодзе, пазбавіўшы стрэсу сваякоў і сябе. Але грамадства не будзе ведаць, ці чалавек шчыра раскаяўся, ці да яго прымяняўся гвалт. Следчым гэта норма развяжа рукі... І могуць таксама фабрыкавацца справы на незгаворлівых бізнэсоўцаў. Гэта папаўненне бюджэту, прычым даволі хуткае.

# Банкаўскі крызіс — нагода для адстаўкі Сідорскага?

**У Нацбанку бачаць пагрозу бяспецы банкаўскай сістэмы краіны.**

Нацыянальны банк заяўляе пра «значную пагрозу» бяспецы банкаўскай сістэмы краіны і чакае ад ураду захадаў у справе стабілізацыі дзяржбанкаў. Пра гэта крыніца ў органах дзяржаўнага кіравання паведаміла «Інтэрфаксу» — агенцтву, блізкаму да Адміністрацыі прэзідэнта.

З адпаведным лістом да прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага звярнуўся старшыня праўлення НББ Пятро Пракаповіч.

У лісце падкрэсліваецца, што небяспечная сітуацыя ў банкаўскім сектары з'яўляецца наступствам крызісу ліквіднасці ў дзяржаўных банках, які нарастае.

Сітуацыя ўскладняецца ростам праблемных крэдытаў, якія за студзень-жнівень выраслі ў 3,3 разу.

Крытычнае пагаршэнне ліквіднасці дзяржбанкаў тлумачыцца высокай крэдытнай нагрузкай у межах фінансавання дзяржаўных праграмаў. Так, за студзень-ліпень 2009 г. банкі павялічылі абём крэдытавання дзяржпраграм у 1,4 разу проці аналагічнага перыяду 2008 года — да 6,76 трлн рублёў.

Як паведамляецца, пры канцы верасня — на пачатку кастрычніка аб'ём затрыманых найбуйнейшым беларускім банкам — «Беларусбанкам» — падаткаў перавысіў 1 трлн рублёў у дзень.

Нацбанк чарговы раз прапануе ўраду знізіць патрабаванні да дзяржаўных банкаў па фінансаванні дзяржпраграмаў.

Альтэрнатывай з'яўляецца чарговая рэкапіталізацыя дзяржбанкаў за кошт бюджэту.

Трывожны званок з Нацбанка здольны справакаваць цунамі на фінансавым рынку.

Фактычна, гаворка ідзе пра тое, што найбуйнейшыя банкі, у тым ліку ашчадны «Беларусбанк», стаяць на мяжы неплацежаздольнасці. Дарэчы, амаль адначасова прайшла інфармацыя, што спыніўся рост аб'ёму рублёвых дэпазітаў у банкаўскай сістэме.

Ёсць толькі адно але. У крытычных абставінах канца 2008 і пачатку 2007 гадоў дзяржсістэма захоўвала поўную немату. Тым часам цяпер небяспечнае высвятленне адносінаў паміж лабістамі розных эканамічных курсаў чамусьці адбываецца ў адкрытую.

Банкіры не хочуць больш крэдытаваць прамысловасць. А прамысловасць знізіць занятасць і прыпыніць выплаты заробкаў без новых крэдытаў. Паўстае пытанне, хто вінаваты? Пальцы аўтаматам спыняюцца на прэм'еру Сяргею Сідорскім.

**Мікола Бугай**



PHOTO:BYMEDIA.NET

**Пракаповіч пайшоў у наступ.**

**Ажыятажу ў банках не назіраецца**

Наш карэспандэнт наведаў шэраг аддзяленняў банкаў у Мінску. Ніякіх чэргаў ці павышанай актыўнасці кліентаў там не назіраецца.

# «Кантрольная фішка» перапісу

**Калі вы маеце ва ўласнасці больш за адну домагаспадарку, на вас складуць «кантрольную фішку».**

У анкеце перапісу насельніцтва 2009 трэцяе пытанне трэцяга раздзела гучыць: ці маеце Вы ў домагаспадарцы альбо ў аднаго з яе членаў ва ўласнасці іншае жылое памяшканне? Вось з чым сутыкнуўся адзін наш чытач: перапісчык сам параіў не пазначаць, што іншая маёмасць у вас усё ж такі ёсць. Тлумачачы, што ў адваротным выпадку перапісчыку давялося б запаўняць на яго «кантрольную фішку». Маўляў, і клопат лішні, і інфармацыя пра маёмасць пойдзе ў падатковую інспекцыю.

На гарачай лініі «Перапісу насельніцтва 2009» карэспандэнту «Нашай Нівы» патлумачылі: «Кантрольная фішка» насамрэч запаўняецца, калі ў вас у валоданні некалькі жылых памяшканняў. Аднак гэтыя звесткі не пойдуць у падатковую інспекцыю, як і дадзеныя па ўсіх іншых пытаннях. Студэнт ляпнуў глупства, можа, не разабраўся, што такое «фішка», а можа, проста расхваляваўся. «Кантрольная фішка» — гэта дакумент, які запаўняецца, каб па месцы іншага памяшкання, якое вам належыць, вас не шукалі для перапісу. Гэтая «фішка» адпраўляецца на іншы пункт перапісу, і ўсё. Падатковая гэтую інфармацыю не даведаецца, не хвалюйцеся».

Ці то студэнты-перапісчыкі настолькі непадрыхтаваныя, што самі не ведаюць, навошта і як запаўняць дакументы і «фішкі»? Ці то яны паддаліся агульнай паніцы? Дакладна толькі тое, што ў кожнага з нас застаецца права адказваць ці не адказваць на пытанні, паводле ўласнага жадання.

**Настасся Шамрэй**

## СЦІСЛА

### Лукашэнка тасуе міліцыю...

Уладзімір Сычэўскі прызначаны начальнікам УУС Брэсцкага аблвыканкама. Да гэтага ён працаваў намеснікам начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама. Начальнікам УУС Гомельскага аблвыканкама стаў Валерый Палішчук. Да гэтага ён працаваў першым намеснікам начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама.

### ...і кіраўніцтва найбуйнейшых прадпрыемстваў

Валерый Кірыенка стаў гендырэктарам «Беларуськалія». Раней ён быў галоўным інжынерам там. Папярэдні гендырэктар Андрэй Башура выйшаў на пенсію. А Беларускі металургічны завод у Жлобіне ўзначаліў Анатоль Савянок. Раней ён займаў пасаду намесніка гендырэктара гэтага прадпрыемства па вытворчасці металічных вырабаў. Лёс папярэдняга дырэктара Мікалая Андрыянава невядомы. Паводле некаторых звестак, ён пераехаў у Расію.

### Збор сродкаў на помнік Сталіну

распачало грамадскае аб'яднанне «За Саюз і камуністычную партыю Саюза» (СКПС). Пра гэта паведаміў каардынатар аб'яднання Леанід Школьнікаў. Яно прапануе ўсталяваць яго ў Мінску. Начальнік упраўлення па гісторыка-культурнай спадчыне Міністэрства культуры Ігар Чарняўскі выказаўся супраць такой ідэі.

### У самым дарагім гатэлі Беларусі знайшлі мёртвай амерыканскую турыстку

50-гадовая жыхарка штата Нью-Ёрк прыляцела ў Мінск 11 кастрычніка ў складзе экскурсійнай групы, якая кіравалася ў Расію. Вечарам яна ўладкавалася ў гатэлі «Еўропа». Прыкладна а 23-й, як кажуць сведкі, жанчына зайшла ў гатэльны нумар. А раніцай 12 кастрычніка яе знайшлі мёртвай у ванным пакоі. Праверку вядзе пракуратура.

**МБ; БЕЛТА, БелаПАН**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй

## за ахвяраванні

Святаславу Г. з Талачынскага раёна.
Міхасю Т. са Слуцкага раёна.
Віталю П., Сяргею К., Васілю Г. з Мінскага раёна.
Н.Л. з Дзятлаўскага раёна.
Л.Ш. з Віцебска.
Антаніне К. з Крупскага раёна.
А.Р. з Шаркаўшчынскага раёна.
Іне П. з Пухавіцкага раёна.
А.Г., Вользе П. з Бабруйскага раёна.
Уладзіміру Я. з Барысаўскага раёна.
Т.Ш., Лілі Л. з Маладзечанскага раёна.
І.В. з Бярозаўскага раёна.
Валянціне М. з Навагрудскага раёна.
Аляксандру П., В.Ж. з Полацкага раёна.

# Памілаванне без суда і следства

Працяг са старонкі 1.

Прычынаў для ўнясення такіх паправак можа быць некалькі. На думку праваабаронцаў, яны разлічаныя ў першую чаргу на тых, хто бярэ хабар, нажываецца незаконнымі шляхамі да і т.п. Фактычна — на чыноўнікаў і бізнэсоўцаў. Можна будзе законна прымусіць іх аддаць сваю маёмасць. У якасці прыкладу прыгадваюць выпадак са старшынёй праўлення гандлёвага дома «Ждановічы» Яўгенам Шыгалавым, якога асудзілі за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, а пасля вызвалілі з-пад варты ўказам Лукашэнкі пад заставу 10 мільярдаў рублёў. У выпадку прыняцця закону такія справы можна будзе праварочваць масава і на легальнай аснове, лічаць эксперты.

**Вольга Жарнасек**

**Камісія па пытаннях памілавання пры прэзідэнце**

структура, утвораная паводле указу Лукашэнкі ад 3 снежня 1994. Яе склад зацвярджаецца ім асабіста. Камісія разглядае хадайніцтвы пра памілаванне асуджаных і прымае рашэнне простай большасцю галасоў. Калі рашэнне станоўчае, хадайніцтва і матэрыялы справы перадаюцца кіраўніку дзяржавы для канчатковага рашэння. Вызваленне асуджаных за эканамічныя злачынствы адбываецца пры ўмове пералічэння ў бюджэт значнай сумы. Цяпер камісію ўзначальвае намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Валер Міцкевіч. Ён змяніў на пасадзе Наталлю Пяткевіч.

## Былыя суддзі Канстытуцыйнага суда: «Гэта адназначнае парушэнне Канстытуцыі»

Валерый Фадзееў і Міхаіл Пастухоў: Можна ставіць крыж на такім панццы, як злачынства.

**Валерый Фадзееў:** Ёсць заканадаўчая ўлада, ёсць выканаўчая, ёсць судовая. У прэзідэнта ёсць толькі права памілавання, але няма права ўмяшання ў судовыя працэсы. Гэта адназначнае парушэнне Канстытуцыі і правоў чалавека. Меру пакарання павінен вызначаць суд. Навошта ўносяцца такія папраўкі? Можа, каб вывесці з-пад крымінальнай адказнасці асобаў, якія змогуць адкупіцца.

**Міхаіл Пастухоў:** Такія змены парушаюць асноўныя прынцыпы крымінальнай адказнасці. Выходзіць, злачынца можа заплаціць грошы і стаць свабодным? Хто набраў хабару, выйдзе на свабоду, а бедны будзе сядзець? Парушаецца галоўны прынцып правасуддзя — прынцып справядлівасці. Можна ставіць крыж на такім панццы, як злачынства. Злачынства становіцца таварам. Гэта будзе разбэшчваць тых, хто парушае закон.

**Гутарыла ВЖ**




**Былая кіраўніца справаў прэзідэнта Галіна Жураўкова выйшла на свабоду пасля прысуду.**

**Як у іншых?**

У Расійскай Федэрацыі памілаванне можа адбыцца толькі ў тым выпадку, калі следства па крымінальнай справе завершана і вынесены вырак суда. Згодна з крымінальным кодэксам РФ, памілаванне ажыццяўляе прэзідэнт краіны. Ён можа не толькі пазбавіць ад пакарання, але і зменшыць тэрмін пазбаўлення волі, зняць судзімасць.

У Германіі прэрагатыва памілавання належыць як цэнтральным органам улады, так і мясцовым. Улады федэральных земляў маюць права памілавання ў дачыненні да крымінальных злачынстваў. Больш цяжкія злачынцы (напрыклад, тэрарысты), могуць быць памілаваныя толькі прэзідэнтам Германіі. Аднак ён можа перадаць права памілавання міністру юстыцыі краіны.

Падобная практыка ўжываецца таксама ў Швейцарыі і ЗША, дзе працэдура памілавання залежная ад цяжкасці ўчыненага злачынства.

А ў Вялікабрытаніі права памілавання да сённяшняга дня належыць выключна манарху. Прычым незалежна ад цяжкасці і роду злачынства.

**АП**

# …перасадзяць на «Жыгулі»

Працяг са старонкі 1.

Пакуль невядома, якімі будуць пошліны на аўто паводле новага кодэкса. У прэс-службе Мытнага камітэта каментаваць гэтую тэму адмаўляюцца. Але наўрад Расія пойдзе на паніжэнне мыту.

«Былі доўгія перамовы, але адназначна будзе расійскі ўзровень — недзе 30—35% на новыя аўтамабілі», — пацвердзіла ў інтэрв'ю «Еўрарадыё» намесніца кіраўніка дэпартамента знешнай гандлёвай палітыкі Міністэрства індустрыі і гандлю Казахстана Алія Алімбетава.

Дзяржаўны мытны камітэт папярэджвае суб'екты гаспадарання, якія займаюцца знешнім гандлем, што новы кодэкс хутчэй за ўсё ўступіць у сілу 1 студзеня 2010 года. І запрашае ўносіць свае прапановы па ўдасканаленні праекта. Гэтай прапанован пакуль што можна скарыстацца. Прынамсі, паспрабаваць гэта зрабіць.

**АП**

# Беларусь прапануе МВФ «іржавае жалеза»

Стаў вядомы папярэдні спіс прадпрыемстваў, якія беларускія ўлады гатовыя выставіць у наступным годзе на адкрытыя таргі ў адпаведнасці з умовамі Міжнароднага валютнага фонду (МВФ).

У папярэдні спіс ўнесены ААТ «Мінскі падшыпнікавы завод», ААТ «Мінскі завод пеністых він», ААТ «Бабруйскі машынабудаўнічы завод», ААТ «Чырвоны мазырaнін», а таксама ААТ «Турыстычны комплекс «Брэст — Інтурыст».

Па мерках беларускай эканомікі, усе яны сярэднія прадпрыемствы, з гледзішча дзяржаўных інтарэсаў стратэгічным з'яўляецца толькі МПЗ.

Прадпрыемствы цяжка аднесці да «фамільнага срэбра». Хутчэй, гэта «фамільнае жалеззе», якое на працягу некалькіх гадоў улады беспаспяхова спрабуюць прадаць.

Прыватызацыя — адна з умоваў далейшае супрацы МВФ з Беларуссю.

**СМ; паводле «Ежедневника»**

# Сітуацыйная кааліцыя: Лукашэнка і Ючшанка

На саміце СНД у Кішынёве адбылася вострая пікіроўка між кіраўнікамі Беларусі і Украіны з аднаго боку і Расіяй з другога.

Паводле словаў Лукашэнкі, ён задаў пытанне міністру фінансаў РФ Аляксею Кудрыну: чым канкрэтна Расія з яе велізарнымі рэзервамі можа дапамагчы краінам СНД?

Ён адзначыў, што на пасяджэнні «моцна выступіў Віктар Юшчанка, яго аргументацыя была забойчай». Паводле слоў беларускага кіраўніка, галоўнай думкай выступлення ўкраінскага прэзідэнта было тое, што ні Беларусі, ні Украіне не былі б патрэбныя крэдыты, калі б функцыянавала зона свабоднага гандлю.

Іншую версію размовы падаў расійскім журналістам міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын. Як перадае агенцтва РІА «Новости», Кудрын заявіў, што «быў здзіўлены тым, што беларускі прэзідэнт Лукашэнка не валодае інфармацыяй аб той фінансавай дапамозе ў выглядзе крэдытаў, якую Расія аказвае Беларусі апошнія два гады».

Ён падзяліўся з журналістамі зместам дыялогу, які, паводле яго словаў, вёўся ў прысутнасці іншых кіраўнікоў дэлегацый удзельнікаў Садружнасці. «Высветлілася, прэзідэнт Беларусі не ведае, што за апошнія два гады Расія аказала яму фінансавую дапамогу ў памеры 3 млрд даляраў ЗША», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Паводле словаў Кудрына, прэзідэнт Беларусі двойчы перапытаў яго, ці сапраўды гэта лічба адпавядае рэчаіснасці, і ўскосна выказаў здзіўленне з нагоды таго, куды ж пайшлі гэтыя грошы.

**Міністр фінансаў Расіі: Лукашэнка не ведае, на што патрачаны тры мільярды даляраў расійскіх крэдытаў.**

«Эмацыйная прамова Аляксандра Рыгоравіча, у якой прысутнічалі пышныя эпітэты і рытарычныя пытанні, звялася да просьбы аб выдзяленні Расіяй яшчэ аднаго крэдыту Беларусі».

**Мікола Бугай**

# «Захад павінен падтрымаць»

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў стварэння прынцыпова новай сістэмы ажыццяўлення кантрольнай дзейнасці. Дзеля гэтага распрацавалі праект указа «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

Нацбанк прапанаваў не распаўсюджваць дзеянне ўказа на праверкі банкаў. На думку Пятра Пракаповіча, гэта звязана з пытаннем незалежнасці Нацбанка, што з'яўляецца ўмовай у працы з Міжнародным валютным фондам. Лукашэнка не пагадзіўся: «Усё, што прапісана ў загадзе адносна банкаў, Захад павінен падтрымаць, бо мы спрабуем тут не кіраваць банкамі, а зберагчы банкаўскую сістэму».

Пры гэтым ён адзначыў: «Вядома, не мусіць быць рашэнняў, якія б пагаршалі імідж краіны перад міжнароднымі арганізацыямі». Міжнародныя фінансавыя інстытуты мусяць быць паінфармаваныя пра новую сістэму кантролю. Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ў гэтым выпадку пазіцыя беларускага боку будзе зразуметая і прынятая.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Мілінкевіч: Аўтарытарная мадэль пазбаўляе краіну будучыні

У Празе пад патранажам Вацлава Гаўла прайшоў штогадовы «Форум-2000». Беларусь рэпрэзентавалі старшыня Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч і старшыня аргкамітэта Партыі свабоды і прагрэсу Уладзімір Навасяд. Мілінкевіч — ён выступаў па-французску — зазначыў, што «аўтарытарная мадэль сама вядзе нашу краіну ў тупік, пазбаўляе будучыні».

Цікавая акалічнасць. У гатэлі «Марыёт», дзе пасяліліся большасць удзельнікаў «Форуму», уранку не было ні халоднай, ні гарачай вады. Гасцям давялося мыцца на першым паверсе ў звычайнай прыбіральні.

### Газету не зарэгістравалі, бо ў рэдактара няма вышэйшай адукацыі

Міністэрства інфармацыі адмовіла ў рэгістрацыі недзяржаўнай рэгіянальнай газеце «Магілёўскі час» з прычыны... адсутнасці вышэйшай адукацыі ў галоўнай рэдактаркі. У канцы верасня Міністэрства інфармацыі не зарэгістравала яшчэ дзве недзяржаўныя рэгіянальныя газеты: «Салігорск плюс» і «Новую газету Бобруйска», спаслаўшыся на тое, што ў жылых памяшканнях нельга займацца вытворчай дзейнасцю. Хоць такой падставы для нерэгістрацыі закон не прадугледжвае. Гаворка ідзе толькі пра выдачу ліцэнзіі — пасведчання, а не саму дзейнасць. Нонсэнсам было б здымаць вытворчыя памяшканні задоўга да пачатку вытворчай дзейнасці і не маючы ліцэнзіі.

**Зміцер Панкавец: МБ; цыт. БЕЛТА**



# Навагрудская Галгофа

**Семдзесят гадоў таму ў вёсцы Ваўкавічы пад Навагрудкам камуністы закатавалі праваслаўнага святара, пакуль мясцовыя жыхары адседжваліся па хатах. Сёння іх нашчадкі зладзілі свой суд над камунізмам. Піша Алесь Кудрыцкі.**

Той, хто едзе па трасе з Карэліч на Навагрудак, адразу заўважае, як змяняецца краявід. Палеткі, перарэзаныя паскамі лясоў ды меліярацыйнымі каналамі, раптоўна саступаюць месца лясістым узгоркам. Штораз вышэйшыя, яны, здаецца, падкідаюць падарожніка да самага неба, па якім, нібы марскія хвалі, імчаць калматыя аблокі. Зямля падстаўляе сонцу свае плечы, на якіх зіхаціць бронзай ды золатам восеньская лістота, дзе-нідзе скрываўленая трывожнымі плямкамі чырвані.

Збочыўшы з гасцінца налева, кіламетраў за дванаццаць ад Навагрудка, мы трапляем у вёску Ваўкавічы. Нас вітаюць старыя могілкі на стромым, парослым дубамі ды клёнамі грудку. Вёска вялікая. На галоўнай вуліцы — двухпавярховыя панэльныя дамы на дзве сям’і: аграгарадок савецкага часу. Шэрасць будынкаў ратуюць пярэстыя кветкі ў прысадах. У адным падворку заўважаем... «Пагоню». Вялікая шыльда з гербам здаля свеціцца белым ды чырвоным. «Толькі ж вы не думайце, што ён гэта з нейкай мэтай зрабіў, — заспакойвае нас мясцовая кабета. — Як школу зачынілі, усё з яе парасцягвалі. Вось ён і ўзяў «Пагоню», каб сцяну адрамантаваць».

## Кола гісторыі

Ваўкавіцкая школа — савецкі будынак з сілікатнай цэглы, вялікі, але пусты. За пыльнымі шыбамі відаць старыя насценгазеты. З дзвярэй на першым паверсе ліецца спеў — ідзе праваслаўная служба. У пакойчык, які раней быў школьнай майстэрняй, не ўбіцца. Мужчынаў вобмаль, большасць наведнікаў — бабулі ў хустках. Тутака і святары з усіх навакольных прыходаў. Архіепіскап Навагрудскі і Лідскі Гурый, паважны, з высокім нягучным голасам, асвячае новую ваўкавіцкую царкву, якая размесціцца ў гэтым кабінеце. Старую, драўляную, якая прастаяла амаль сто гадоў, разабралі саветы яшчэ ў 1964 г. Зрабілі з яе прыбудову да першай вясковай школы. Пасля і тую школу раскідалі, бярвенне спалілі ў лазні, ды збудавалі новую, цагляную. Гады з тры таму і яе зачынілі — няма вучняў. Цяпер у адным з пакойчыкаў былой школы зноў адчыняецца царква. Кола вясковай гісторыі замкнулася, ды толькі круціць яго ўжо амаль няма каму.

Убранне новай ваўкавіцкай царквы па-вясковаму наіўнае, без шыку, але прыхаджанам надта даспадобы. Атмасфера, нібы на Вялікдзень. Хор выводзіць «О, Божа Спасе». Бабуля ў чырвонай хустцы, седзячы на ўслончыку ля сцяны, шэпча суседцы: «Ты б глянула, які прастол харошы зляпілі, усё-ўсё! От хораша, от хораша! Людзі далі троха, колькі маглі...»

Адна з кабетаў абыходзіць народ з кошыкам — «скарбонкай». Прыхаджанкі сціскаюць у зморшчаных далонях тысячныя паперкі. Царкву аднаўлялі за грошы мясцовых жыхароў. Рабіць складкі пачалі ад сёлетняй Радаўніцы. Жыхары Ваўкавічаў ды навакольных вёсак наважыліся на такую талаку невыпадкова. Ужо сем дзесяцігоддзяў над імі вісіць покрыва жахлівай гісторыі, якая не дае гэтым мясцінам спакою, вярэдзіць душу.

## Крывавы шлях

«Тут праўды ніхто вам не скажа. Поўнае праўды. Тут многа чаго кажны бачыў, кажны чуў, ды асаблівыя не любяць надта гаварыць, хто надта шмат знаюць», — абачліва кажа, зірнуўшы жывымі цікаўнымі вачыма, невысокі дзядок у сіняй пляскатай кепцы ды старым, але ахайным палітончыку.

82-гадовы Сава Самсонавіч Васюк — адзін з нямногіх мужчынаў, якія прыйшлі на службу ў новую царкву. Тут што ні чалавек — то гісторыя. Вось і спадар Васюк сербануў долі: у армію загналі на Урал, памарозіў там сабе ногі.

Але тое страшнае, пра што ён апавядае, адбылося, калі ён быў 12-гадовым хлапчуком.

У верасні 1939 г. Ваўкавічы на пару тыдняў трапілі ў паласу безуладдзя (польская ўлада сышла, а савецкая як след не ўсталявалася). Адначы ночы некалькі чалавек пагрукаліся ў хату, што стаяла насупраць царквы. Тут жыў вясковы бацюшка Мікалай Нядзведскі разам з сям’ёй — жонкай Верай і маленькай дачкой.

Гэта былі падпольшчыкі, актывісты мясцовай партыйнай ячэйкі. Прыход савецкай улады развязаў ім рукі, ап’яніў кар’ернымі перспектывамі. Бацюшку павялі праз вёску. І не проста вялі, а збівалі, вырывалі бараду ды вусы, білі жалезным прутом па баках. Калі праходзілі праз вёску Амневічы, айца Мікалая прымусілі паўзці на карачках, адзін з катаў ехаў на ім верхам. Мясцовыя жыхары моўчкі назіралі з-за фіранак. Абараніць свайго бацюшку не выйшаў ніхто: баяліся за сябе і за свае сем’і.

Неўзабаве каты збочылі на хутар, дзе на два дні замкнулі скалечанага святара ў склепе. На трэці дзень павялі яго далей, у лес ля вёскі Сянежыцы. Знайшлі там схаваны ад людскіх вачэй лясісты ўзгорак і пачалі забіваць. Спачатку прымусілі яго капаць сабе магілу. Пасля адрэзалі пакутніку вушы. Пасля выкалалі вочы. Пасля метадычна пераламалі косткі і, раз’юшаныя нечым, што яны пачулі ад ахвяры, адцялі бацюшку язык ды дзетародны орган... Абвязалі вяроўкай ногі, перакінулі цела праз сук ды апусцілі ў магілу. Зразумеўшы, што бацюшка памёр, каты пакінулі яго, скручанага, ляжаць на макаўцы гары...

«Свае гэта былі людзі, свае, — кажа Сава Самсонавіч. — Яны былі палітыканты пры Польшчы... На яго заеліся. Нядобрыя людзі, грубыя...» І раптам паўжартам, але з насцярогай, дадае: «Ці толькі не зрабіце мне, што я быў замешаны! Мне ўжо 83 гады, шчэ мяне цягаць будуць!..»

Дагэтуль жыве страх у людзях.

## Хросны ход

Хросны ход ліецца з царквы на вуліцу і кіруецца ў той самы шлях, якім каты вялі айца Мікалая Нядзведскага. Хто не можа далучыцца да грамады, выходзяць на ганкі хатаў з кветкамі, хрысцяцца. Архіепіскап бярэ венічак і мімаходам акрапляе іх святой вадой.

Ззаду калону суправаджаюць «хуткая» і міліцэйскі «ўазік». У полі стаіць напаўразбураны прывідны будан з пустымі вачыма ваканіцаў. «Гэтую ферму на месцы могілак пабудавалі, — падказвае манашка. — Тут дзеці раней чарапамі ў футбол гуляліся». Абсурдная карціна. Навокал палеткі неабсяжныя, вольнага месца — хоць заліся. А вось жа выбралі менавіта гэты пагорачак з могілкамі, спляжылі бульдозерам крыжы ды збудавалі ангар для быдла... А ў выніку — пустка.

Каб не цягнуцца паволі ўгару, марнуючы паліва, міліцыянты абга-



З АРХІВУ ЗМІТРА АРЦЮХА

Айцец Мікалай Нядзведскі.



З АРХІВУ С.РАМАНОВІЧА

З прыхаджанамі.



З АРХІВУ ЗМІТРА АРЦЮХА

Царква ў Ваўкавічах. 1937 год.



Нялёгкае ўзыходжанне на навагрудскую Галгофу.



Георгій Шапялевіч — пляменнік закатаванага святара.



Калісьці царкву разбурылі пад школу. Цяпер школу ператварылі ў царкву.

няюць калону ды становяцца на адхоне, сярод кустоў. Наблізіўшыся да іх, архіепіскап на момант прыпыняецца, мерае поглядам «уазік» і... шчодра абдае яго святой вадой. Заспетыя знянацку, міліцыянты ў кабіне разгублена пасміхаюцца.

Дарога ідзе штораз вышэй, з аднаго пагорка на іншы. Краявід адчыняецца фантастычны. На даляглядзе — блакітныя ды фіялетавыя стужкі далёкіх лясоў на ўзгорках, схаваныя ў смузе. Бліжэй — залатыя ды зялёна-смарагдавыя пагоркі ды раскіданыя паміж імі хаты. Пераваліўшы за гару, людзі збочваюць з дарогі. Крочаць краем лесу, заглыбляюцца ў гушчар. Зялёны паўзмрок. Спевы аддаюцца таямнічым рэхам. Дарога ідзе ярам, глыбей і глыбей. І раптоўна разумееш, што стаіш ля падножжа сапраўднай гары, такой высокай, што даводзіцца задзіраць галаў, каб пабачыць сосны на яе вяршаліне. Вось яна, навагрудская Галгофа.

Пачынаецца нялёгкае ўзыходжанне. Людзі паволі караскаюцца па слізкім, крутым схіле. Бабулі трымаюцца адна за адну, маладзейшыя дапамагаюць старэйшым. Вось, нарэшце, і крыж на макаўцы гары. Дрэвы над ім расступаюцца, зверху ліецца святло. Калі зірнеш з гары ўніз, то рэшта людзей нагадвае рассыпаныя пацеркі.

Пачынаецца малебен. Нават каманда «хуткай дапамогі» ў чырвонай уніформе трымае ў руках свечкі. «Гэтым подзвігам, па-чалавечаму бессэнсоўным, а па-хрысціянскаму прыкладным, айцец Мікалай выявіў сябе сапраўдным пераймальнікам Госпада нашага Ісуса Хрыста», — звяртаецца да грамады архіепіскап. Царква разглядае пытанне залічэння закатаванага святара ў лік беларускіх святых. Магчыма, на гэтым месцы паўстане царква ці капліца, а хросны ход будзе адбывацца штогод.

## Аповед сведкі

Людзі стаяць паўколам ля сівенькай бабулі, якая пачынае свой сумны аповед. Яе бацькі былі адзінымі, хто вызваўся дапамагчы жонцы айца Мікалая адвезці на могілкі цела пакутніка. За гэта іх потым пераследавалі саветы.

«Матушка вельмі з бацькамі нашымі жыла-дружыла, — распавядае бабуля. — І вось матушка тры дні хадзіла, шукала яго. І потым на трэці суткі, гэта я кажу ісцінна, сасніла яна сон. Што хадзі туды, за Гаравічамі тут гэтымі, Сянежычы, і звярні направа, ён ляжыць у лясочку. Яна па гэтым сне пайшла, шукала і кашканула, і знайшла яго шкарпэтку. І прыйшла, і кажа, хто ж... Але ж вёска Ваўкавічы, сто дваццаць хат, ніхто: пабаяліся ўсе. А маці мая на бацьку кажа — закладай. І прыехалі сюды, на гэтае месца, забралі.

Я, мне было тады трынаццаць гадоў, разумееце. Маці нават мяне не дапускала, каб я надта ўжо глядзела. Ён знявечаны быў, увесь акрываўлены, вочы выпараныя, язык выразаны, вушы абрэзаныя ... Барада, вусы, усё вырвата, і так паламаны, знайце, што як адзявалі, дык, разумееце, усе костачкі яго, як жывога, пхалі ў гэтую... Вот што я магу толькі сказаць...

Пры немцах прыходзілі да матушкі, «дак давай, скажы, хто выходзіў за ім». Але яна сказала: ужо я яго не падыму, хто яго забіраў з гэтага места, я нікому не скажу».

Скончыўшы аповед, старая кабета шчымліва звярнулася да ўсіх прысутных: «Дзякуй вам усім-усім, мае дарагія, што вы жывяцё, дзякуй вам, што вы памаглі тут аднавіць усе гэты пахароны... Каб вас Бог зберагаў да канца, вашых дзетак, усіх вас...»

Здаецца, не засталося нікога, на чые вочы не набеглі б слёзы.

## Пляменнік пакутніка

Адзін з удзельнікаў хроснага ходу звяртаў на сябе асаблівую ўвагу. Сівавалосы мужчына, гадоў пад пяцьдзесят, высокі, добрае паліто, да бляску начышчаныя боты. Ён шчыра маліўся, але трымаўся сціпла. Гэта быў пляменнік закатаванага святара, Георгій Шапялевіч. Ягоная маці, у дзявоцтве Клаўдзія Нядзведская, была сястрой айца Мікалая. «Перапаўняе найглыбейшае пачуцце смутку, — падзяліўся пачуццямі Георгій Віктаравіч. — Узгадваю словы матушкі, цёці Веры: усяму аддасца належнае, усё стане на сваё месца. І ўся наша сям'я, усё пакаленне Нядзведскіх ні на кога з людзей, якія здзейснілі гэтае жахлівае злачынства, мы не трымаем ліха. Усяму аддасца Творцам. А мы ў душы пранясём на ўсю рэшту нашага жыцця памяць пра гэтага добрага чалавека, пастыра Божага, які да канца данёс свой крыж на гэтую гару».

Георгій Іванавіч выкладае ў Гандлёва-эканамічным каледжы ў Навагрудку. Ён распавёў, што нарадзіўся айцец Мікалай у 1890 г. на Беласточчыне, у сям'і праваслаўнага святара. З усіх дзесяці дзяцей Мікалай адзіны пайшоў па шляху бацькі. Дзеці атрымалі добрую адукацыю. Гэтак, сястра ваўкавіцкага бацюшкі Дар'я, як і яе маці, скончыла Бястужаўскія курсы ў Смольным інстытуце ў Пецярбурзе, а брат Сяргей — Чугуеўскую юнкерскую вучэльню. У 1919 г. ён загінуў на Самары разам з тысячай іншых белых афіцэраў, якіх патапілі бальшавікі. Ідэйныя таварышы гэтых бальшавікоў пагрукаліся ў дзверы яго брата ў 1939 г.

Калі глядзіш на фота айца Мікалая і на твар яго пляменніка, то адразу адчуваеш добры сямейны стрыжань. А вось катаў напаткаў незайздросны лёс. Па словах мясцовых людзей, два з іх павесіліся, адзін утапіўся ў ваўкавіцкай сажалцы, іншы напіўся, і конь, збіўшыся са шляху, закруціў яго насмерць у воз. Яшчэ адзін згінуў недзе ў сібірскіх лагерах.

## «Аджывае дзярэўня»

На аўтобусным прыпынку ля зачыненай школы (ці, лепей казаць, ля новай царквы) паселі на ўслоне тры бабулі. Першыя дзве — маладзейшыя (гадоў пад семдзесят). Адна гаманкая, а іншая, наадварот, прамаўляе сіплым гучным шэптам (дактары няздольныя вярнуць голас). Назвацца жанчыны збаяліся, аджартаваліся: «Вы нас пасадзіце, мусіць?». Прадставіліся толькі 82-гадовая Вера Антонаўна ды 84-гадовы Іван Мікалаевіч. Вера Антонаўна — мініяцюрная бабулька ў плашчыку ды з кіёчкам. Мае ясны розум ды чысты голас. Іван Мікалаевіч у маладосці, відавочна, быў высокі, ладны мужчына. Не прысеў ні разу, як жанчыны адпачывалі, усё стаяў, абапіраючыся на кіёк.

Старыя ўзгадваюць сталінскія часы без асаблівай сімпатыі. «У нас, у Агародніках, былі такія. Сказалі, што ён займаўся, як той казаў, супраць савецкай улады. Прыйшлі, сабірайся. І тыкеле яго бачылі. Вось гэтак і рабілася. Час гэтакі, як той казаў, пераходны. Безуладдзе», — узгадвае Іван Мікалаевіч. «Тая баба сказала, што дзякуй Богу, што Сталін памёр», — узгадвае гаманкая кабета. «З Карэліцкага раёна», — дадае шэптам суседка. «Дваццаць пяць гадоў далі», — пацвярджае дзед.

Сёння часы вальнейшыя. «Цяпер што хочаш гавары, хай хто хоча ўжо памірае», — кажа гаманкая. «Пра Лукашэнку што хочаш гавары», — згодна сіпіць яе знаёмая. «Цяперака лепш жыць, спакайней!» — адказваюць усе разам. «Раней якія ў страху людцы былі, ястрабкі былі, з пісталетамі хадзілі», — вохкае ціхмяная бабуля. «Дзяцей голых пакінуць, а забяруць і паехалі», — абураецца гаманкая. «Ужо за немцамі то было ж не вытрываць! — распавядае Вера Антонаўна. — Не ведаеш, ці ты немцу адкрываеш, ці то партызану».

«Велькі наш прыход быў!» — са смуткам пераключаецца яна.

Заімжэў дожджык. Старыя разгарнулі парасоны ды патупалі дахаты.

## «Тут жыццё сапраўднае»

Адным з нешматлікіх маладых людзей на хросным ходзе быў Зміцер Арцюх. Сам родам з Ваўкавічаў, ён выбіўся ў людзі, вывучыўся ў БДУ, зрабіўся журналістам. Пра яго ўся вёска ведае. Цяпер Зміцер прыехаў сюды здымаць дакументальны фільм пра ваўкавіцкую трагедыю.

«Бог сказаў, што тыя, хто ганьбіць мяне, будзе пакараны да чацвёртага калена. А тыя, хто праслаўляе, будуць усхваленыя да тысячнага калена. З таго часу прайшло семдзесят гадоў. Я лічу, зараз жыве ўжо чацвёртае пакаленне. Гэтае пакаранне, відаць, здымаецца, і пачынаецца адраджэнне».

Ці верыць Зміцер у тое, што вёска ў Беларусі здольная адрадзіцца? «Я вось нават сам збіраюся з'ехаць з Мінска і жыць тут. У горадзе цісне ўсё. А тут жыццё сапраўднае».

## Суд памяці

У суседняй з Ваўкавічамі вёсцы Сянежыцы дагэтуль ляжыць святы камень, на якім, кажуць, ёсць адбітак нагі Маці Божай. Непадалёк ад вёскі — святы роў з крынічкай. Даўней туды людзі ад сянежыцкага каменя на каленях у святы роў па гаючую ваду хадзілі. Хадзілі, ды перасталі. Чаму? Бо акурат паміж імі — тая самая лясная гара, дзе бацюшку закатавалі.

Але праявілі людзі добрую волю — і ўсё пачало змяняцца. Была гара ў лесе страшнай — зрабілася святой. Раней людзі ў жаху абміналі гэтае месца, цяпер туды памаліцца пойдуць.

Сярод тых, хто выйшаў на хросны ход у Ваўкавічах, большасці не было на свеце ў тым страшным 1939 г. Здаецца, што ім да сямідзесяцігадовай справы? Забілі бацюшку — камуністы, адседзеліся ў хатах — дзяды ды бацькі, царкву раскідалі — саветы. Прычым тут яны?

Уражвала, наколькі востра тамтэйшыя людзі адчуваюць калектыўную віну, якая вісіць над імі. Забілі бацюшку — свае. Збаяліся спыніць забойцаў — уласныя, родныя. А царкву дык і ўвогуле зламалі ўжо пры іх памяці. Жыхары самі сабралі грошы на новы храм, паставілі вялікі драўляны крыж на месцы забойства, справілі новы мармуровы помнік пакутніку, пачысцілі ды прывялі да ладу вясковыя могілкі, сабраліся на хросны ход. Апамяталіся людзі. Ушанаваўшы свайго бацюшку, яны прынеслі сімвалічнае пакаянне за справы продкаў, яны зладзілі свой суд над уладай цемры — не ў высокіх кабінетах, а ва ўласных сэрцах.

Мы, беларусы, звыкліся лічыць сябе ахвярамі. Мала каму з нас хапае адвагі азірнуцца ды падумаць: а можа, і мы памыляліся? Маўчалі там, дзе трэба было змагацца за праўду? Што, калі мы і сёння нешта можам зрабіць інакш? У жыхароў Ваўкавічаў атрымалася пераасэнсаваць сваё няпростае мінулае — значыцца, у іх з'явіўся шанец зазірнуць у будучыню.

**Фота Таццяны Гаўрыльчык**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Актывісты Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў правялі ў парку каля МТЗ мітынг у гонар Дня барацьбы за годную працу. Яны патрабавалі адмены кантрактнай сістэмы і павышэння заробкаў.**

# Падазроны падрад на рэстаўрацыю гродзенскіх замкаў

**Рэстаўрацыяй гродзенскіх Старога і Новага замкаў мае займацца прыватная фірма «Еўрапрэстыж». Цікавасць навіне надае тое, што фірма належыць новапрызначанаму кіраўніку праўладнага Саюза палякаў Беларусі Станіславу Сямашку.**

У інтэрв'ю інфармагенцтву БелаПАН Сямашка заявіў, што зараз «праект знаходзіцца на стадыі перамоваў і нашаму прадпрыемству даюць праектаванне аднаўлення двух замкаў. Актам будзе перададзеная ўся дакументацыя на аднаўленне, мы запросім найлепшых спецыялістаў у гэтай галіне, каб зрабіць усё прыгожа».

Валерый Крывец, кіраўнік Упраўлення па капітальным будаўніцтве аблвыканкама, якое адказвае за рэстаўрацыю замкаў, у размове з карэспандэнтам «НН» паведаміў, што ніякай інфармацыяй на гэты конт не валодае. Ён адзначыў, што ўсе праектныя працы праводзяцца ўстановай «Гроднаграмадзянпраект».

Вострую рэакцыю выклікала тое ж пытанне ў кіраўніка Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, што месціцца ў замках, Юрыя Кітуркі: «Хто такі Сямашка? Гэта не для яго. Проста смешна».

Нам не ўдалося знайсці інфармацыі пра тэндар, на аснове якога быў бы размешчаны выгадны падрад на рэстаўрацыю замкаў.

У афіцыйным Саюзе палякаў каментаваць рэстаўрацыйныя планы спадара Сямашкі адмовіліся. Сябра незалежнага Саюза палякаў Андрэй Пачобут кажа: «Такія праекты павінны абмяркоўвацца публічна. Прыкра, што гэта адбываецца кулуарна».

Адсутнасць грамадскага абмеркавання пытанняў, звязаных з захаваннем і аднаўленнем гісторыка-культурнай спадчыны, адзначаюць і гродзенскія краязнаўцы. Паводле слоў Андрэя Вашкевіча, даходзіць да кур'ёзаў. Падчас работ на Савецкай плошчы ў Гродне «Гроднаграмадзянпраект», галоўны падрадчык, наняў будаўнічую арганізацыю з Ваўкавыска. І пры выяўленых парушэннях накладаў штрафныя санкцыі на ваўкавыскіх будаўнікоў. Фактычна зарабляючы грошы на чужых памылках.

Тая ж арганізацыя займалася і праектаваннем рэстаўрацыі гродзенскіх замкаў. У студзені было выканана ўжо 10% праектных работ. Кіраўнік праекта, архітэктар Уладзімір Бачкоў, адзначаў тады, што «Стары замак у Гродне будзе адрэстаўраваны ў выглядзе каралеўскай рэзідэнцыі, якой ён быў у XVI стагоддзі». Ён таксама сцвярджаў, што кожны этап праекта будзе праходзіць спецыяльную працэдуру зацвярджэння ў Міністэрстве культуры.



І Стары, і Новы замкі ўнесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ім прысвоена першая катэгорыя як унікальным аб'ектам міжнароднага значэння.

**Алесь Пілецкі**

## Расійскі афіцэр на вучэннях скраў шампунь

6 кастрычніка ў горадзе Жодзіна ў краме «Белмаркет» зафіксаваны дробны крадзеж.

Малады чалавек спрабаваў вынесці з крамы шампунь. Яго спынілі ахоўнікі. Злодзей спрабаваў уцячы праз акно, аднак яго схапілі. Высветлілася, што малады чалавек — афіцэр расійскай арміі, які прыбыў у Беларусь на вучэнні. Далейшы лёс злодзея будзе вырашаць вайсковая пракуратура.

У краме — што месціцца на вуліцы з паэтычнай назвай «імя 50-годдзя Кастрычніка» — з намі гаварыць адмовіліся, сказалі толькі, «што пісаць пра гэта нельга».

**НШ**

## Дэзерцір з беларускага войска 16 гадоў хаваўся па лясах і хутарах

Ён збег на пачатку 1990-х з адной з частак Віцебскага гарнізона. Пяць гадоў хаваўся ў лясах на Гродзеншчыне. Затрымалі яго, калі ён зайшоў да родзічаў. Яго асудзілі на тры гады турмы з адтэрміноўкай выканання прысуду. Дазнаўшыся, што вайсковая пракуратура дамагаецца перагляду справы, небарака... зноў уцёк. І гойсаў па лясах аж да 2009 года.

Міжгарнізонны ваенны суд перагледзеў справу дэзерціра і адпусціў таго на ўсе чатыры бакі, бо тэрмін даўніны злачынства скончыўся.

**Ядвіга Сташэўская, Еўрарадыё**

## Журналісту разбілі шыбы

Інцыдэнт адбыўся ў ноч з пятніцы на суботу. Распавядае журналіст незалежнай газеты «Белорусы и рынок» Генадзь Барбарыч: «Я прыехаў з дачы і заўважыў, што фортка ў спальні адчынена. Я не стаў звяртацца ў міліцыю, бо падумаў, што раптам шпінгалет адарвала ветрам. Але прыкладна а 12-й гадзіне ночы я пачуў моцны ўдар па падваконні — бутэлька засталася ў самім шкле, а ад шыбаў адбягаў малады чалавек у чорнай куртцы і чорнай вязанай шапачцы».

На раніцу Генадзь Барбарыч звярнуўся да міліцыянтаў, і тыя вынялі пляшку з-пад піва.

Гэта другі падобны выпадак — першая правакацыя адбылася ў 2002 годзе, калі журналіст, працуючы ў інфармацыйнай кампаніі БелаПАН, напісаў артыкул пра забойства пад ягонымі вокнамі актывіста незарэгістраванай групоўкі «Расійскае нацыянальнае адзінства».

**Барыс Гарэцкі, радыё «Рацыя»**

## СЦІСЛА

### Бандыт давёў юнака да смерці

У Жлобіне 17-гадовы юнак выкінуўся з акна, не вытрымаўшы здзекаў. Раней судзімы чалавек, нецвярозы, запрасіў яго ў сваю кватэру «пагаварыць». А там замкнуў дзверы і нацкаваў ратвейлера, стаў кпіцца. Каб ратавацца, юнак кінуўся ў акно з трэцяга паверха. І сканаў ад траўмаў, атрыманых пры падзенні.

### Пабіў нагамі «Мэрсэдэс»

Крымінальная справа па артыкуле «Хуліганства» заведзена на 34-гадовага беспрацоўнага маладзечанца. 23 верасня каля дома №35 па вуліцы Скарыны ён нагамі біў па машыне «Мэрсэдэс». У выніку машыну памяў: шкоду ацанілі на мільён 500 тысяч рублёў.

### У Віцебску новы касцёл

— першае асвячэнне за 124 гады. Адкрылі яго 10 кастрычніка. Стаіць ён на вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Будынак мае форму крыжа: ўвышкі 32 м, удоўжкі — 28 і ўшыркі 18 м.

### Пасольства Расіі ў Мінску пераехала на новы адрас

З 12 кастрычніка пасольства Расіі ў Мінску працуе ў новым будынку. Новы адрас пасольства: вул.Нававіленская, 1а. Тэлефоны: 250-36-66, 288-67-68 (пасольства); 222-49-84, 222-49-85 (консульскі аддзел). Гадзіны працы: з 9.00 да 16.00.

Раней расійскае пасольства размяшчалася на вул. Старавіленская.

**МБ; БЕЛТА; Рэгіянальная газета**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскія відэа і фоты. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сцыслая.

# Засталося толькі загаварыць

**Сацыялагічнае даследаванне «Новака» выявіла кансалідацыю нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў.**

Парадокс назіраецца толькі з мовай. Палова апытаных лічаць людзей, якія заўжды гавораць толькі па-беларуску, «сапраўднымі беларусамі, патрыётамі». Пры гэтым ужывае беларускую мову толькі меншасць.

## Кім мы сябе асэнсоўваем?

Калі параўноўваць з дадзенымі апытання Інстытута сацыялогіі 2004 года, ідэнтыфікацыя беларусаў як «савецкіх людзей» і «еўрапейцаў» памяняліся месцамі. Пяць гадоў таму 16,8% беларусаў адносілі сябе да савецкіх людзей і 11,3% — перадусім да еўрапейцаў. Цяпер жа наадварот — 12,5% супраць 15%.

## Чым для нас ёсць мова?

Адказы на пытанні, датычныя беларускай мовы, вызначылі дзве супярэчлівыя тэндэнцыі. Як адзначае дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Віталь Сіліцкі, мова і культура сцвердзіліся ў якасці ідэнтыфікацыйных сімвалаў, і гэта новая якасць, але адбыўся адкат у плане актыўных моўных практык. Мову любяць, але на ёй не размаўляюць. Такі падыход характэрны для большасці.

З аднаго боку, рэспандэнты згодныя, што мова з'яўляецца нацыянальна-культурнай каштоўнасцю, а з іншага — яны не гатовыя для практычнага яе выкарыстання. Наогул, пасіўнае выкарыстанне мовы распаўсюджана нашмат болей за актыўнае. Свабодна беларускай мовай валодаюць 34,2% апытаных, але часта або пастаянна карыстаюцца толькі 19,7%. З іншага боку, 22% «не чытаюць і не гавораць» па-беларуску. Найбольшая група — тых, хто разумее гутарковую мову, але кепска піша і практычна не размаўляе (43,2%). Можа, проста не спрабавалі?

Паказальна, што рэспандэнты пазначылі, што беларускую мову часцей выкарыстоўваюць у зносінах са сваякамі, сябрамі і, асабліва, землякамі. А вось у публічных месцах, у транспарце і на працы — намнога радзей. Такім чынам, каланіяльнае выцясненне беларускай мовы з публічнай прасторы працуе і надалей. Выкарыстанне беларускай мовы замыкаецца ў вузкім коле «сваіх».

Асноўная прычына невыкарыстання беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці — адсутнасць «беларускамоўнага» атачэння, а не няведанне мовы.

**Чым з'яўляецца для Вас беларуская мова? %**

| | |
|---|---|
| Нацыянальным набыткам, што трэба берагчы і шанаваць | 47,1 |
| Нацыянальным сімвалам беларусаў | 36,9 |
| Мовай беларускай вёскі, глыбінкі | 16,6 |
| Адной з еўрапейскіх жывых моваў, каторай неабходна карыстацца сёння | 12,3 |
| Мовай, што практычна не патрэбная ў сучасным жыцці | 8,6 |
| Мовай беларускай інтэлігенцыі | 8,0 |
| Нічым для мяне не з'яўляецца | 3,9 |
| Мовай беларускай апазіцыі | 3,4 |

**Што Вы думаеце пра людзей, якія заўжды гавораць толькі па-беларуску? %**

| | |
|---|---|
| «Сапраўдныя беларусы, патрыёты» | 48,2 |
| «Дзярэўня» | 5,4 |
| «Апазіцыя» | 4,0 |
| «Дзіўныя людзі» | 3,0 |
| «Нацыяналісты» | 3,6 |
| «Працуюць на публіку: хочуць пакрасавацца, «выпендрыцца» | 6,9 |
| «Эліта нацыі» | 5,1 |
| Не зважаю на гэта (ніколі не думаў пра гэта) | 24,7 |
| НВ/ЦА | 4,1 |

| Ці хацелі б вы … | Так | Не |
|---|---|---|
| Болей ведаць пра беларускія традыцыі і звычаі | 74,9 | 19,6 |
| Болей ведаць пра беларускую нацыянальную кухню | 73,1 | 20,0 |
| Болей ведаць пра беларускую гісторыю | 72,6 | 21,9 |
| Ведаць болей беларускіх песняў, казак, паданняў | 59,7 | 32,9 |
| Глядзець мастацкія фільмы па-беларуску | 40,7 | 50,1 |
| Слухаць і глядзець болей тэле- і радыёперадач па-беларуску | 30,6 | 58,1 |
| Палепшыць сваё веданне беларускай мовы | 29,5 | 60,7 |
| Чытаць творы сусветнай літаратуры па-беларуску | 24,7 | 65,7 |
| Мець магчымасць заўсёды карыстацца беларускай мовай ў грамадскіх месцах (вуліца, крама, транспарт) | 24,3 | 62,1 |
| Мець магчымасць афармляць дакументы па-беларуску | 20,9 | 67,4 |
| Мець магчымасць атрымліваць адукацыю па-беларуску | 19,3 | 66,8 |
| Мець магчымасць увесь час карыстацца беларускай мовай на працы | 14,6 | 70,5 |

Апытанне прайшлі 1011 рэспандэнтаў з розных куточкаў краіны, рознага ўзросту і сацыяльнага стану. Апытанне правяла сацыялагічная лабараторыя «Новак» у кааперацыі з Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў пры падтрымцы кампаніі «Будзьма».




**Беларуская мова застаецца мовай прыватнай прасторы. У незалежнай Беларусі ёй пакуль цяжка вырвацца ў публічную. Надпіс па-беларуску прыцягвае ўвагу як дзіва. На фота: vox populi пра субкультуру emo на вакзале ў Івацэвічах.**

Можна зрабіць выснову, што беларусы не выракаюцца роднай мовы, хацелі б на ёй размаўляць, але не маюць неабходных для гэтага ўмоваў.

## Курсы павышэння самаідэнтыфікацыі

Апытанне паказала, што людзі жадаюць больш ведаць пра беларускія традыцыі, нацыянальную кухню, гісторыю, а траціна апытаных хацела б палепшыць сваё веданне беларускай мовы.

## «Хто как хаціт, тот так і гаварыт»

Вялікую надзею для адраджэння камунікацыйнае функцыі мовы дае факт выключна пазітыўнага ўспрымання грамадствам яе носьбітаў. 49,3% апытаных лічаць людзей, якія размаўляюць выключна па-беларуску, «сапраўднымі патрыётамі». Такое стаўленне дае спрыяльную глебу для патэнцыйнага пераходу на беларускую мову. 6,9% рэспандэнтаў думаюць, што беларускамоўныя людзі працуюць на публіку. Такое меркаванне найбольш папулярнае сярод моладзі. 5,4% апытаных адразу вешае ярлык — «дзярэўня»! Але ў той жа час 5,1% лічаць беларускамоўных элітай нацыі. «Усё зразумела — апазіцыя», — упэўненыя яшчэ 4% апытаных.

## Купала адстае ад Коласа

Асобны раздзел апытання прысвечаны нацыянальным каштоўнасцям беларусаў. Рэспандэнты назвалі самага вядомага гістарычнага дзеяча, найвыбітнейшы архітэктурны помнік і літаратурны твор і — у рэшце рэшт — сімвал краіны.

Апытаныя паспрабавалі скончыць сказ «Калі беларускі пісьменнік, то гэта...» У лідэрах апынуліся песняры — Якуб Колас і Янка Купала. У спаборніцтве класікаў перамог Колас (29,1%). У Купалы трошкі менш — 27,2%. За імі ў рэйтынгу вядомасці ідуць празаікі Васіль Быкаў (8,7%), Іван Шамякін (4,0%) і Уладзімір Караткевіч (3,8%). Сярод жывых літаратараў народнай папулярнасці не здабыў ніхто.

## Самы вядомы верш — гімн

Калі ж рэспандэнты паспрабавалі назваць самы значны літаратурны твор беларускага аўтара, то нарэшце ўзгадалі Мележа. Ягоных «Людзей на балоце» назвалі 18,4% апытаных. Творчасць Якуба Коласа — «Новая зямля» і «На ростанях» — заняла другое і трэцяе месца, набраўшы 9,3% і 5,0% галасоў адпаведна.

Далей ідуць «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага і творы Васіля Быкава (па 2,3%). А вось самым вядомым вершам аказаўся... гімн Беларусі. Твор Клімковіча і Карызны заняў пачэснае дзесятае месца (1,1%).

## Лукашэнка не дацягвае да Скарыны і Машэрава

Наступнае пытанне датычылася самых вядомых беларускіх гістарычных дзеячаў. Своеасаблівы конкурс «Імя Беларусі» выйграў Францыск Скарына. Яго назваў кожны чацвёрты (25,5%). Яшчэ адзін «чалавек-праспект» Пётр Машэраў трымаецца на другім месцы (12,0%).

Кастусь Каліноўскі і Еўфрасіння Полацкая набралі 4,4% і 3,6% адпаведна і апярэдзілі Аляксандра Лукашэнку (3,6%). Больш за працэнт набралі яшчэ Тадэвуш Касцюшка і Леў Сапега.

## Зубр і бусел супраць сцяга і герба

Людзі ўжо прызвычаіліся да дзяржаўнай атрыбутыкі і атаясамліваюць яе з нацыянальнымі сімваламі. Герб (22,2%), сцяг (20,7%) і гімн (2,9%) агулам сабралі ледзь не палову галасоў апытаных. Канкурэнцыю ім спрабуюць скласці зубр (10,9%), бусел (6,5%), бульба (3,8%) і валошка (2,6%). Пасля згадваецца і герб «Пагоня» (2,2%).

## Адкуль мы?

Большасць апытаных мяркуе, што беларуская дзяржаўнасць мае свае вытокі ў ВКЛ (37,3%) ці ў Полацкім і Тураўскім княстве (18,5%). Толькі 12,1% лічаць БССР пачаткам беларускай дзяржаўнасці. 9,7% галасоў за РБ, а 5,3% — за БНР.

57,4% рэспандэнтаў лічаць галоўным нацыянальным святам 3 ліпеня. Другім па папулярнасці стаіць Дзень Перамогі (9 траўня). Калі ўлічыць, што гэтыя святы звязаныя з ВАВ, то становіцца відавочнай значнасць перамогі ў вайне для нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў.

## Ідэнтычнасць і рэжым

Апытанне яшчэ раз нагадала, што беларускае грамадства застаецца падзеленым на няроўныя паловы. З тэзісам «Беларуская дзяржава клапоціцца аб сваіх грамадзянах, як бацькі ў сям'і дбаюць аб сваіх дзецях» цалкам ці часткова пагадзіліся 60,5% апытаных. Гэта сённяшні стан прыхільнікаў існага рэжыму.

У той жа час зусім нямала — аж 31,9% — цалкам ці часткова пагадзіліся са сцверджаннем: «Я крытычна стаўлюся да той дзяржавы, якая цяпер існуе ў Беларусі. Той вобраз, які навязваецца афіцыйнай прапагандай, для мяне непрымальны». Гэтая вялікая маса людзей схіляецца да змены аўтарытарнага статус-кво.

З меркаваннем «Вытокі нашае дзяржавы ў Вялікім Княстве Літоўскім, таму для Беларусі натуральна арыентавацца на еўрапейскую мадэль», згодныя 59,8% апытаных. А вось гэта ўжо тая патэнцыйная кааліцыя, на падтрымку якой можна разлічваць пры правядзенні новага палітычнага курсу краіны, арыентаванага на еўраінтэграцыю. Праўда, каб такую кааліцыю стварыць, трэба заваяваць давер нацыянальна-дэмакратычнага электарату.

## Разбітыя стэрэатыпы

Віталь Сіліцкі падсумаваў, што даследаваннем былі разбітыя некалькі міфаў. Стэрэатып наконт таго, што беларуская мова — мова моладзі і Заходняй Беларусі, не пацвердзіўся. Наадварот, выявілася, што найбольш прыхільна да яе ставяцца на Магілёўшчыне. Там людзі не гатовыя перайсці на беларускую мову, але ўхваляюць дзяржаўныя крокі ў бок беларусізацыі.

«Прапанентам беларускай мовы трэба больш гаварыць *на мове*, чым *аб мове*», — сканчвае Сіліцкі.

**Вольга Жарнасек, Ягор Марціновіч**

**Якім героям ці выдатным асобам мінулага мусіць быць пастаўлены помнік?**

1. Машэраву
2. Шамякіну
3. Еўфрасінні Полацкай…

**Вашы любімыя беларускія спевакі?**

1. Паплаўская
2. Ціхановіч
3. Дарафеева...

**Вашы любімыя беларускія музычныя групы?**

1. Песняры
2. Сябры
3. Верасы
4. Цягні–піхай
5. Джэй–морс
6. Ляпіс Трубяцкой
7. Лепрыконсы
8. NRM
9. Бяседа
10. Харошкі...

**Вашы любімыя тэатры**

1. Імя Янкі Купалы
2. Оперы і балета
3. Імя Горкага...

**Калі выдатны гістарычны дзеяч, то...**

1. Скарына
2. Машэраў
3. Каліноўскі...

**Калі помнік архітэктуры Беларусі, то...**

1. Мірскі замак
2. Брэсцкая крэпасць
3. Нацыянальная бібліятэка...

Больш падрабязныя вынікі апытання шукай на сайце nn.by.

*«Гэта — небяспечная з’ява, якая кідаецца партыямі, арганізуе оргіі і кіруе краінай пад назвай «Італія». Гэтая з’ява, гэтая хвароба, гэты вірус пагражае стаць прычынай маральнай смерці краіны Вердзі. Калі толькі глыбокае ванітаванне не адрыгне яе са свядомасці італьянцаў, атрута разбурыць вены і знішчыць сэрца адной з найбагацейшых еўрапейскіх культур...»*

**«З’ява Берлусконі» — са зборніка «Эль Куадэрна» партугальскага пісьменніка Жазэ Сарамага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі. Кнігу адмовіліся друкаваць у Італіі.**

# Феномен Берлусконі

або Дно заходнееўрапейскай палітыкі, або Залатое дно заходнееўрапейскай палітыкі. Піша **Вікторыя Грынеўская**.



Імя прэм’ер-міністра Італіі Сільвіё Берлусконі часта мільгае ў СМІ. Толькі невялікая частка інфармацыі тычыцца яго палітычных заяваў. Асноўная ж месціцца ў рубрыцы «Скандалы», дзе абмяркоўваюцца непаліткарэктныя жарты, непратакольныя паводзіны ці забавы сіньёра Сільвіё з мадэлямі.

Берлусконі мае добры загар, заўжды шырока ўсміхаецца, аднолькава сябруе з Бушам, Пуціным і Кадафі.

«Я не святы», — кажа ён у адказ на абвінавачванні ў чарговым адзюльтэры, і мужчыны з ім моўчкі згаджаюцца. Сярод лідэраў «Вялікай васьмёркі» сіньёр Сільвіё вызначаецца салідным капіталам. Берлусконі — мільярдэр (яго актывы складалі $9,4 мільярды ў 2008 г.) і трэці найбагацейшы італьянец у рэйтынгу Forbes. Мала хто ведае, што Нікаля Сарказі, цяперашні французскі калега Берлусконі па G8, неяк працаваў топ-адвакатам Сільвіё па французскіх справах.

Берлусконі — гэта новы Медычы, алігархічны кіраўнік, што нібы выйшаў з рэнесансавай Фларэнцыі ў XXI стагоддзе, прасякнутае ідэаламі дэмакратычных свабод... У чым жа сакрэт яго феномену?

## Ад простага міланца да мільярдэра

*«У Італіі мяне разглядаюць амаль як немца з-за майго працагалізму. Я з Мілана, горада, дзе людзі найбольш працуюць. Праца, праца, праца — і я амаль што немец».*
**Сільвіё Берлусконі**

Сільвіё Берлусконі нарадзіўся 29 верасня 1936 г. у Мілане. Яго бацька быў банкаўскім клеркам. У 1961 г. Сільвіё скончыў юрыдычны факультэт Міланскага дзяржуніверсітэта і абараніў дыплом па прававых аспектах рэкламы. Падчас навучання ва ўніверсітэце малады Сільвіё працаваў бас-гітарыстам у адной з музычных груп, якая гастралявала па круізных лайнерах. Там спрытны юнак заводзіў карысныя знаёмствы сярод багатых і ўплывовых італьянцаў.

Бізнэс-кар’ера Сільвіё пачалася ў канцы 1960-х, калі ён задумаў пабудаваць жылы квартал на ўсходніх ускраінах Мілана. Як Берлусконі ўдалося прафінансаваць праект, застаецца невядомым: яго імя знікла з усіх дакументаў па справе будаўніцтва, а ніткі гэтай таямнічай справы губляюцца ў лабірынтах афшорных кампаній.

У 1973 г. Берлусконі заснаваў невялікую кампанію кабельнага тэлебачання Telemilano, у 1980 г. прыдбаў яшчэ адзін канал Canale 5. Затым прыкупіў тэлеканалы Italia Uno (1982) і Rete 4 (1984), якія потым сталі каркасам гіганцкага холдынга Mediaset.

ТВ-імперыя Mediaset знішчыла манаполію дзяржаўнай тэлекампаніі RAI на эфір. Гэта адбылося не без дапамогі добрага сябра Сільвіё, тагачаснага прэм’ер-міністра Італіі Бетына Краксі (скончыць жыццё ўцёкамі з краіны ў выніку карупцыйных скандалаў). Яшчэ тры гады пасля гэтага каналам Берлусконі забаранялася трансляваць навіны і рабіць палітычныя каментары. Толькі законам 1990 г. яго ным каналам быў нададзены статус паўнавартасных нацыянальных.

Што тычыцца іншых бізнэс-актываў Сільвіё, то ў 1978 г. ён заснаваў першую медыя-групу Fininvest. Зноў жа, крыніцы яе фінансавання засталіся невядомымі праз складаную сістэму арганізацыі кампаній холдынга. Хоць шматлікія дзяржаўныя пракуроры займаліся расследаваннем гэтай справы. У 1986 г. Берлусконі купіў футбольны клуб Milan. У 1988 г. стаў суўладальнікам найбуйнейшай сеткі ўнівермагаў. Ад 1990 г. — суўладальнікам найбуйнейшага ў Італіі выдавецкага дома Mondadori. Акрамя таго, Берлусконі належыць найбуйнейшае рэкламнае агенцтва краіны, страхавая кампанія, інвестыцыйныя і пенсійныя фонды... Чаму ж найбагацейшы медыямагнат раптоўна пайшоў у палітыку? Звычайнае чалавечае славалюбства ці нешта іншае?

## Узлёты і падзенні палітычнай кар’еры

*«Мне не трэба ісці ў палітыку дзеля ўлады. У мяне ёсць дамы па ўсім свеце, цудоўныя яхты, прыгожыя самалёты, прыгожая жонка, прыгожая сям’я ... Я прыношу сябе ў ахвяру».*
**Сільвіё Берлусконі**

Ніхто не сумняваецца, што ў Сільвіё ёсць прыгожыя дамы і яхты па ўсім свеце, і ён пайшоў у прэм’еры не дзеля ўзбагачэння. Але менш за ўсё на свеце ён хацеў ахвяраваць сабой і сваімі актывамі на карысць італьянскай Феміды, якая ў 1993 г.

КАМЕНТАР

# Берлусконі можа не паспець да Лукашэнкі

У італьянскага сябра Лукашэнкі вялікія праблемы. Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Паводле прагнозу «Еўраньюс», цяпер той найхутчэй што будзе вымушаны падаць у адстаўку, і ў краіне пройдуць датэрміновыя выбары.

Такім чынам, прылёт Берлусконі ў Мінск пад пытаннем. Нагадаю: аб хуткім візіце шэфа ў Беларусь падчас нядаўняга наведвання нашай краіны заявіў кіраўнік італьянскай дыпламатыі Фраціні.

Праўда, сам Берлусконі храбрыцца і заяўляе, што з пасады не сыдзе. Але, так ці інакш, яму, магчыма, будзе не да вояжаў у «апошнюю дыктатуру Еўропы». Бо зараз экстравагантнага прэм’ера, які наламаў нямала рознага кшталту дроў, могуць засыпаць судовымі разборамі, што дагэтуль былі замарожаныя праз ягоны імунітэт.

Сваімі дзеяннямі і авантурамі Берлусконі яскрава ілюструе, што палітыкі — такія ж грэшныя людзі, як і простыя смяротныя. Вынесем за дужкі «дзяўчатак». Яму закідаюць аўтарытарныя замашкі, ціск на прэсу. Прышпіраюць абвінавачваннямі ў спробе подкупу сенатараў, даванні хабару, парушэнні падатковага заканадаўства.

Во, блін, што значыць гнілая дэмакратыя! Ніякай павагі да першай асобы. Дзяўбуць і ў хвост і ў грыву.

Магчыма, беларуская палітычная сістэма была б для Берлусконі вяршыняй жаданняў. Цыкнуў — і ўсе як мышы пад мятлой.

Ці выпадкова яны з Лукашэнкам адразу паразумеліся, калі той лётаў вясною ў Рым?

Але ж Берлусконі кіруе (пакуль што) у Італіі. І хоць дэмакратыя там далёка не ідэальная (ідэальнай нідзе няма і не будзе), механізм стрымак і супрацьвагаў, дзякуй богу, спрацоўвае. І Канстытуцыйны суд там, як бачым — не прыдатак адміністрацыі (ён прызнаў неадпаведным канстытуцыі закон аб недатыкальнасці прэм’ера, які Берлусконі ў свой час і працягнуў). І ў незалежнай прэсы стае моцы, каб валтузіць першую асобу краіны (плюс медыямагната) так, што толькі пер’е ляціць.

Нарэшце, назіраюць і структуры Еўрасаюза. Так, Еўрапарламент мае разглядзець пытанне аб наездах Берлусконі на прэсу.

Карацей, да Мінска ў рангу прэм’ера Берлусконі можа так і не даляцець. Ну а турыстам тут ён, мусіць, не надта патрэбны.

Эх, такі піяр зрываецца ў тутэйшых трубадураў! Падвёў ты, браце Сільвіё!

блізка падабралася да дзейнасці ягонага любімага тварэння Fininvest.

Так ці інакш, але Берлусконі вырашыў удзельнічаць у выбарах 1994 г., для чаго стварыў новую партыю Forza Italia («Італія, наперад»). Сільвіё задзейнічаў свае вялізныя медыярэсурсы для агітацыйнай барацьбы, у выніку чаго стаў прэм'ер-міністрам. Праўда, ненадоўга. Сабраная ім правацэнтрысцкая кааліцыя вужа і яжа развалілася. Выбары 1996 г. Сільвіё прайграў левацэнтрысцкай кааліцыі Рамана Продзі.

У 2001 г. Берлусконі стварыў новы правацэнтрысцкі блок «Дом свабоды» (La Casa delle Liberta), з якім перамог на парламенцкіх выбарах 2001 г. На гэты раз сіньёр Сільвіё прапанаваў цэлы комплекс перадвыбарных абяцанняў, якія ён назваў «Кантракт з італьянцамі». «Кантракт» прадугледжваў спрашчэнне падатковай сістэмы, скарачэнне беспрацоўя ўдвая, разгортванне маштабнага будаўніцтва, памяншэнне ўзроўню злачыннасці, а таксама павелічэнне мінімальнай пенсіі да 516 еўра ў пераліку.

Перамога Берлусконі была ўпэўненай, але наперадзе яго чакалі цяжкасці. Рашэнне аб уводзе італьянскага вайсковага кантынгента ў Ірак у 2003 г. (трэцяга па велічыні пасля ЗША і Вялікабрытаніі) выклікала абурэнне ў грамадстве. Парламенцкія выбары 2006 г. Сільвіё прайграў усё таму ж Рамана Продзі, на валасок. Перавага склала ўсяго 25224 галасы з 38 мільёнаў. Эксперты ж пастанавілі, што з усіх пунктаў «Кантракта з італьянцамі» Берлусконі выканаў толькі адзін: павысіў мінімальныя пенсіі.

Стагнацыя эканомікі працягвалася і пры Рамана Продзі, чый урад станавіўся ўсё больш непапулярным. Гэта прывяло да датэрміновых парламенцкіх выбараў у красавіку 2008 г., калі ў літаральным сэнсе «абноўлены» Сільвіё (ён зрабіў падцяжкі на твары і нарасціў валасы) зноў перамог левацэнтрыстаў ужо з новай партыяй «Народ свабоды» (Il Popolo della Liberta), у якую трансфармавалася Forza Italia. На гэты раз Сільвіё паабяцаў выбаршчыкам вывезці неапалітанскае смецце, вывесці эканоміку са стагнацыі і прыняць больш жорсткія меры супраць нелегальных мігрантаў.

## Абвінавачанні і супярэчнасці

*«Я ўніверсальны рэкардсмен па колькасці судовых працэсаў за ўсю гісторыю чалавецтва, а таксама сярод іншапланетных істот».*
**Сільвіё Берлусконі**

Подкуп суддзяў, ілжэсведчанні, хабары, фальшывыя справаздачы, нявыплаты падаткаў, прысваенні, злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, антыканстытуцыйная змена законаў, супрацоўніцтва з мафіяй, наркатрафік, карупцыя... «577 візітаў паліцыі, 2500 судовых слуханняў і 174 мільёны еўра за паслугі юрыстаў», — падае статыстыку сам Сільвіё. Тым не менш, Берлусконі не правёў аніводнага дня ў турме, дзякуючы як добрым юрыстам, якія прафесійна зацягвалі заведзеныя справы, так і сабе самому.

Парламенцкая большасць пад загадам Сільвіё прымала эфектыўныя законы, якія абараняюць прэм'ера ад пачатых супраць яго судовых працэсаў (кшталту днямі адмененага закону аб наданні прэм'ер-міністру спецыяльнага імунітэта, закону аб скарачэнні тэрміна пазоўнай даўнасці ў адносінах некаторых фінансавых спраў, закон аб недаверы мясцовым суддзям і г.д.). Ад іспанскага суда ў справе па парушэнні антытраставых законаў Сільвіё зноў жа выратаваў імунітэт чальца Еўрапарламента...

Сільвіё судзілі за лжэсведчанне аб членстве ў масонскай ложы P2 (прызнаны вінаватым судом Вероны, але трапіў пад амністыю); за хабар за лжэсведчанне брытанскаму юрысту Дэвіду Мілсу, мужу Тэсы Джоўвел — міністра з кабінета Блэра (Мілс у лютым 2009 г. быў асуджаны брытанскім судом на 4,5 года турмы); за хабар у памеры 23 мільярды лір прэм'ер-міністру Італіі Бетына Краксі за паслугі ва ўрэгуляванні праблем з Mediaset, а таксама за сувязі з сіцылійскай «Коза Нострай» і лабіраванне яе інтарэсаў.

Пра сувязі Берлусконі з мафіяй пачалі падазраваць, калі ён наняў вядомага мафіёзі Віторыё Мангана конюхам на сваю вілу ля Мілана. Блізкі сябар Сільвіё, Марчэла Дэль-Ультры, сенатар ад Forza Italia і топ-мэнэджэр Publitalia, быў асуджаны ў Палерма ў 2004 г. на 9 гадоў турмы за супрацоўніцтва з мафіяй. У 1996 г. былі атрыманыя паказанні аднаго з былых інфарматараў мафіі, які сцвярджаў, што «Коза Ностра» ў 1980-я «крышавала» Fininvest, а таксама падтрымала Сільвіё на парламенцкіх выбарах 1994 г. узамен за заканадаўчыя палёгкі (адмена жорсткага турэмнага рэжыму для мафіёзі). Праўда, двухгадовае афіцыйнае расследаванне не пацвердзіла гэтых фактаў. Яшчэ адзін арыштаваны ў 2002 г. мафіёзі, Антоніё Джыуфры, сведчыў, што Берлусконі быў у непасрэдным кантакце з босам сіцылійскай мафіі Бантадэ яшчэ з 1970-х, як і з неапалітанскай мафіёзнай сям'ёй Гравіяна...

## Шоу для электарату

*«Я занадта давяраю розуму італьянскага народа, каб думаць, што там ёсць так шмат прыдуркаў, якія б галасавалі супраць уласных інтарэсаў».*
**Сільвіё Берлусконі**

Берлусконі — папуліст-харызматык, па сваёй экстравагантнасці роўны Чавесу і Лукашэнку. Ён пазіцыянуе сябе як «чалавек з народа, які зрабіў сябе сам». Італьянцы празвалі яго Il Cavaliere («Кавалер» або «Коннік»). Кавалер-мільярдэр, які можа сабе дазволіць усё і не баіцца нічыіх дакораў.

Ён павінен быць зоркай не толькі на ўласных, але і на сусветных тэлеканалах, каб пацвердзіць свой зорны імідж! У гэтым крыецца частковае тлумачэнне неаднаразовых скандальных паводзінаў Берлусконі.

Калі Сільвіё з'яўляецца перад фрау Меркель і кажа ёй «куку», гэта азначае, што «яна, хоць і канцлер Германіі, але для мяне проста жанчына». Калі ён крычыць на ўсю залу пасяджэння G20 «Містэр Абама!» і раздражняе гэтым каралеву Элізабэт II, то хоча паказаць, што «Барак Абама — мой новы найлепшы сябар, і мне ўсё роўна, што падумае снобская англічанка». Калі Берлусконі падчас жалобнай цырымоніі па забітых салдатах NATO гаворыць па мабільніку (па версіі Сільвіё — з турэцкім прэм'ерам), то «схаванае пасланне» можна расшыфраваць як «я вышэйшы за вашыя няўцямныя афіцыйныя працэдуры».

А да непрыстойнасці непаліткарэктныя выказванні Берлусконі пра італьянскіх жанчын, суддзяў і замежных палітыкаў, якія ён з усмешкай называе «проста жарты»? За мяжой іх разглядаюць як хамства, ціха заплюшчваючы на гэта вочы, а вось у самой Італіі погляды разыходзяцца.

Знаходзяцца людзі, якім паводзіны Берлусконі падабаюцца. Гэта і ёсць электарат Сільвіё, які рэгулярна глядзіць манапалізаванае тэлебачанне, чытае газеты Il Giornale (належыць брату Сільвіё, Паола) ці Il Foglio (часткова належыць жонцы Берлусконі Вероніцы).

## Ці толькі ў мадэльках справа?

*«Мы скандалім не ад таго, што ён разбэшчаны, а ад таго, што стыль ягонай палітыкі цалкам супадае са стылем ягонага асабістага жыцця, адным словам — бардэль».*
**Блогер Фабрыцыё**

Апошнім часам з'явіліся публікацыі аб пазашлюбных адносінах Берлусконі з эскорт-мадэлямі і элітнымі прастытуткамі. Некаторыя з іх ахвотна дзеляцца гэтым досведам з журналістамі, што не надта падабаецца законнай жонцы прэм'ера. Як гэта ні дзіўна, але прыгоды з жанчынамі павышаюць рэйтынг Берлусконі. Большасць італьянцаў — мужчыны гарачыя, тэмпераментныя і толькі радуюцца, калі хоць за кімсьці з іх і ў семдзесят гадоў бегаюць дзяўчаты. Тым больш, што прыватнае жыццё ў Італіі заўсёды лічылася недатыкальнай тэрыторыяй любога чалавека.

Некаторыя палітолагі ўсё ж лічаць, што сэкс-скандалы — гэта піяр-акцыя з боку самога Берлусконі. Навошта? Бо абвінавачанні ў адультэры з якой-небудзь Наэмі-Летыцыяй — гэта не абвінавачанні ў сувязях з «Коза Нострай» ці ў гвалтоўнай змене заканадаўства, ці ў няздольнасці вывесці краіну з крызісу. Ці ў манапалізацыі СМІ і падаўленні свабоды слова (Італія — адзіная заходнееўрапейская краіна, якая мае азначэнне «часткова свабодная» паводле рэйтынгу Freedom House).

Як толькі левыя пачынаюць крытыкаваць урад Берлусконі, Сільвіё пераводзіць крытыку ў плоскасць свайго прыватнага жыцця. Гэта падхоплівае электарат, які абурана патрабуе, каб аматара жаночай прыгажосці пакінулі ў спакоі. Зручна, праўда?

Палітычнае жыццё Італіі — гэта бясконцае ТВ-шоу. А Берлусконі — здольны акцёр. Вам гэта нікога не нагадвае?... Сярод італьянскай апазіцыі няма такой харызматычнай фігуры, як Il Cavaliere...

Так, палітычная культура Італіі мае шмат супольнага з постсавецкай.

З тым толькі адрозненнем, што цяпер Берлусконі, які сабраўся наведаць Беларусь, пазбаўлены сваёй прэм'ерскай недатыкальнасці. Суд Італіі пастанавіў, што закон, які бароніць Берлусконі ад крымінальнага пераследу, праведзены Берлусконі ж праз парламент, парушае канстытуцыйны прынцып роўнасці ўсіх грамадзян перад законам. А як пачнецца разгляд адразу трох раней замарожаных працэсаў, невядома, ці ўтрымаецца caro Silvio на сваёй пасадзе.



З гераіняй аднаго з апошніх сэкс-скандалаў Патрыцыяй д'Адар'ё.





Палітыка — штука жорсткая. Абдымацца прыходзіцца з рознымі тыпамі.



Аднойчы Берлусконі прылюдна падклікаў Меркель: ку-ку!

## У небе зор шмат, або Парадокс — слова грэчаскае

**Адтанцавала сваё свята беларускае пісьменства на Смаргоншчыне. Колькі слоў ад мяне — звычайнага грамадзяніна гэтай краіны, што там пабываў.**

На афіцыйнай цырымоніі адкрыцця свята адзін дзяржаўны абласны дзеяч з Гродна ўрачыста казаў пра ўшанаванне «пісьменнікаў як мінулых, так і сучасных гадоў».

Тым часам нияк няёмка мясціўся са сваімі кніжкамі ў гандлёвых радах нястомны Уладзімір Содаль — адзін з асноўных даследчыкаў Багушэвіча.

Мала хто ведае, што да Дня беларускага пісьменства па замове Смаргонскага райвыканкама ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» была падрыхтавана анталогія літаратурнай Смаргоншчыны «Колькі ў небе зор…» (1000 экзэмпляраў). Аўтарам з'ўляецца вядомы ў літаратурных колах краіны маладзечанец Міхась Казлоўскі. Аб'ёмная і па-майстэрску выкананая работа ўжо адзначана ў водгуках і газетных рэцэнзіях. У дзень свята яна не прадавалася ў Смаргоні ні ў палатках, ні ў кнігарні! Нам патлумачалі, што выданне даравалася людзям, што запрошаны на свята. Неяк брыдка казаць, але Міхася Казлоўскага, як і літаратараў са Смаргоншчыны Аляксандра Камінскага, Алеся Жамойціна, сярод запрошаных не значылася. У нашым небе шмат зор. Іншых…

Яшчэ адзін эпізод. Ледзь праціснуўся між гэтых зор, каб сказаць слова, адзін з аўтараў помніка Францішку Багушэвічу, Леў Гумілеўскі, пры яго адкрыцці. Між іншым — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны мастак Беларусі.

Згаданага вышэй Уладзіміра Содаля, дарэчы, таксама не запрасілі афіцыйна. Навошта… Пажылому чалавеку прыходзілася думаць, якім чынам яшчэ дабрацца да той Смаргоні.

Эх, мітусня, мітусня…

**Сяргей Цімошка, Маладзечна**

## Ленін пад клёнам

**«Центральную площадь (белорусского города) можно узнать по шагающему Ильичу» (АНТ, 28.08.2009). А яшчэ можна дадаць для большай пэўнаты — строгаму, задумліваму ці то пазітыўнаму.** Сотні і сотні «Леніна» па ўсёй Беларусі. Рэдкая з'ява сталася ў Нясвіжы ў 90-я гады мінулага стагоддзя: пры рэканструкцыі адміністрацыйна-грамадскага і культурнага цэнтра горада помнік Леніну быў перанесены з віднага месца на Цэнтральнай плошчы (былая Рынкавая) да яе ўскраіны. Ільіч перайшоў як бы «на канспірацыю» і аказаўся акурат… пад звычайным клёнам. А галава праз дзесятак гадоў стаяння правадыра дык увогуле амаль уся закрываецца зараз лістамі гэтага дрэва…

Міжволі нарадзіліся радкі:

Народы вёў ён на змаганне
І шлях рукою асвяціў.
Цяпер да клёна на спатканне
Прыйшоў. Як юнаком хадзіў.

Дзяўчына тая мо не прыйдзе…
Ён твар лістотаю прыкрыў,
Бо крыўда краскаю ўзыдзе,
Як абсмяе яго парыў…

Калі казаць ужо сур'ёзна —
Ільіч, ты правільна зрабіў.
Хоць не адразу, трохі позна,
А ўсё-ткі месца саступіў.

**Сяргей Брадавы, Маладзечна**

## А хіба не крадзе бюракрат

**А хіба не крадзе бюракрат на працы, нічога не робячы?** Ездзіць на нашай машыне, на нашым паліве і не прыносіць карысці народу, дзяржаве, ды яшчэ і не дае працаваць іншым. Колькі машын з надпісам «Дзяржнагляд» і іншымі. Магчыма, гэты злодзей горшы за таго, што штосьці нясе.

**С.Гаравач, Шчучын**

## У сваім Чыкага я памятаю пра сваё Глыбокае

**Я з вялікім сумам у сэрцы прачытала артыкул «Загадкі страшнай знаходкі».** Хацелася б і мне прыехаць у праваслаўную царкву ў Глыбокім і памаліцца за супакой душ знойдзеных там у скляпенні Божых людзей. Не ведаю, якога часу гэта ахвяры. Але добра памятаю, што рабілася за Сталінам.

Мне было ўсяго восем гадоў, як прыйшлі да нас саветы. Многа прыйшлося чуць ад маіх Мамы і Таты аб здзеках, учыненых тады і пазней супраць нашага беларускага народа. Людзі Божыя гінулі як мухі тады. А калі прыйшлі да нас немцы, усю віну складалі саветы на немцаў.

Маю сям'ю тады ледзь не павезлі ў Сібір толькі таму, што Мама сказала: «Што гэта за ўлада, што мы мусім даваць і даваць, а нам нічога не дастаецца ўзамен?» Саветчык тады ўзяў блакнот са свайго партфеля і запісаў нашу сям'ю на вываз у Сібір, зазначаючы, што наша сям'я — «ворагі Савецкага Саюза». Гэта было 21 чэрвеня пасля абеду, а назаўтра распачалася вайна. Савецчыка знайшлі ўтопленага ў рацэ Бярэзіне разам з яго партфелем назаўтра, 22 чэрвеня. І ў тым партфелі ў блакноце было і наша прозвішча. Так мы цудам урававаліся ад смерці, якую нам рыхтавалі саветы, вывезшы ў Сібір.

**Вера Ромук, Чыкага (ЗША)**

## Як я быў акупантам

**У Беларусі шмат тых, хто выконваў «інтэрнацыянальны доўг» у былой Чэхаславакіі, у тым ліку і аўтар гэтага ліста. Але я ехаў туды не ваяваць.**

Мне, маладому хлопцу, вельмі хацелася ўбачыць свет, убачыць на свае вочы, што дзеецца там. Не зважаючы на моцную савецкую прапаганду, удавалася ўбачыць і пераканацца на фактах, на чыім баку праўда.

Амаль на самай мяжы, у раёне станцыі Чоп, нам выдалі каскі і новыя аўтаматы, а таксама па тры «ражкі» з патронамі. Памятаю, што страху не было, але было нейкае пачуццё хвалявання і спадзявання на сустрэчу з нечым новым, невядомым. Раніцай, яшчэ ў прыцемках, наш аўтамабільны батальён рушыў цераз мяжу, непадалёк ад Кошыцаў. Свае новыя аўтаматы мы закінулі за сядзенне ў кабіне аўтамабіля, каб не перашкаджалі, і каскі мы пазымалі, бо моцна балела шыя, але хутка надзявалі, калі бачылі прыблізнае камандзіраў. Наша калона расцягнулася ўздоўж ад Кошыцаў да Прагі, ды і ўсё падарожжа па тэрыторыі Чэхаславакіі доўжылася каля трох дзён. Мы ехалі ў калоне, змяняючы адзін другога за рулём, і любаваліся краявідамі незнаёмай нам мясцовасці.

Калі прыбылі на месца прызначэння, камандзір батальёна абвясціў, што заўтра атрымаем акупацыйнае абмундзіраванне і акупацыйны паёк. Так я стаў акупантам…

На акупаванай савецкімі войскамі тэрыторыі былі сустрэчы з рознымі людзьмі: і з маладымі, і з пажылымі. Адзін малады чэх падарыў мне значок з выявай Масарыка…

Да савецкай акупацыі я адносіўся адмоўна. Гэта было насілле над невялікай еўрапейскай краінай.

У гэтым годзе спаўняецца 40 гадоў, як я пакінуў Чэхаславакію, дэмабілізаваўшыся з войска. Ніякіх адзнакаў у ваенных білетах не рабілася, «не рэкамендавалася» дзе-небудзь успамінаць аб сваім знаходжанні ў Чэхаславакіі.

Трэба падзякаваць Богу, што аўтамат не спатрэбіўся, бо за час службы не зрабіў з яго ніводнага выстралу, нават вучэбнага. Аб акупаванай краіне засталіся самыя светлыя ўспаміны. Назаўсёды ў душы засталася гэтая прыгожая і працавітая еўрапейская краіна.

**Бярнард Пакульніцкі, Гарадзея (Нясвіжскі раён)**

## Сталінка — Галінка

**Яе ўсе, колькі я помню, звалі Галяй, Галінкай. Але аднаго разу мне трапіў на вока яе пашпарт.** Разгортваю яго і бачу — наша Галінка ніякая не Галінка, а Сталіна, Сталінка.

Гэта мяне дужа зацікавіла. От што пачуў: «Мой тата быў заўзяты партыец, — згадвала Сталінка-Галінка. — Апошнім часам, да вайны, працаваў у Чэрыкаўскім райкаме партыі інструктарам. Усіх чатырох дачушак называў у гонар знаных дзеячаў, іхніх дзяцей. Першую — Розай, у гонар нямецкай рэвалюцыянеркі Розы Люксембург. Затым была Клара — у гонар Клары Цэткін. Трэцюю назваў Святлана. Гэткае імя мела Сталінава дачка. Мяне ён назваў Сталінаю.

Я нарадзілася ў 1940 годзе. То як мне жылося з такім гучным імем? А ўсяляк было… Пакуль была малая і было ціха, дык і нічога. Ганарылася: імя Сталіна нашу. А як пачалася вайна і падрасла трохі, затрывожылася: за такое імя мяне немцы могуць першай парашыць. Але, хвала Богу, нашу сям'ю як райкамаўскую эвакуявалі ў глыбокі тыл.

Пасля вайны трохі супакоілася. А тут смерць Сталіна. Усе галасілі па ім. Самоцілася, галасіла і я. А чаго? А неўзабаве пачалі культ Сталіна развенчваць: «Сталін такі, Сталін гэткі», і я пачала саромецца свайго імя, таіцца. Калі знаёмілася з кім, называла сябе Галінай. Балазе, імя Сталіна меладычнае з імем Галіна, трохі сугучнае з ім.

— А ці не было ў вас жадання афіцыйна, юрыдычна змяніць сваё імя? — неяк я пацікавіўся ў сваёй субяседніцы.

— А навошта?!

Гэтае імя — адзінае, што засталося ў мяне як памяць пра тату, які загінуў у першыя гады вайны.

**Уладзімір Содаль, Мінск**




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Рэклама ў мінскім метро.**

## Кракадзіл у бронзе

**З усіх персанажаў аршанскага парку я пазнаў хіба Кракадзіла Гену з Чабурашкам ды вялізную статую Гулівера з маленькім чалавечкам на далоні. Дасціпныя аршанцы імгненна ахрысцілі гэтых персанажаў — Саша і Коля…**

Адносна малой скульптурнай формы ў гарадскім ландшафце Беларусі можна ўжо пісаць дысертацыі. Асабліва адносна яе недарэчнасці ды бескарыснасці; такіх прыкладаў і ў Мінску безліч. А пачатак гэтаму шквалу безгустоўшчыны, здаецца, былі пакладзены ў Лідзе, дзе насупраць гасцініцы паставілі бронзавую скульптуру «Камандзіровачны» — дзядзька ў пацяганым гарнітурчыку з валізай…

Такіх «камандзіровачных» нямала прынеслі Оршы леташнія «Дажынкі». Ля ўваходу ў ЗАГС паставілі загадкавае бронзавае крэсла з гэткім жа загадкавым чараўнічкам перад ім. Паглядзеўшы на шыльду ўстановы, можна здагадацца, што гэты чараўнічак мае дачыненне да такога акту грамадзянскага стану, як шлюб, і, напэўна, нейк да казкі пра Папялушку.

У дзіцячым парку над Дняпром загадкавых скульптур значна больш. З усіх персанажаў парку я пазнаў хіба Кракадзіла Гену з Чабурашкам ды вялізную статую Гулівера з маленькім чалавечкам на далоні. Дасціпныя аршанцы імгненна ахрысцілі гэтых персанажаў — Саша і Коля…

Затое ў Оршы цяпер маюць поўнае ўяўленне аб тым, на якіх казачных і мультыперсанажах раслі сённяшнія віцебскія чыноўнікі. Бо аршанскія да вызначэння — каго ўвасабляць у бронзе ў дзіцячым парку і ля ЗАГСу — доступу не мелі.

**Юрка Копцік, Орша**



ПАЎЛІНА КУПРЫСЬ

**Шумяць дубы над магутнымі дубовымі крыжамі. Старадаўнія могілкі на пясчаным грудзе ў вёсцы Рагозна (Брэсцкі раён).**

## Беларусы не атрымаюць нічога

**Маючая адбыцца прыватызацыя стане яшчэ адной несправядлівасцю для Беларусі.** Усё эканамічнае багацце Беларусі (заводы, банкі, транспартныя сістэмы) прыватызуюць заходнія і расійскія кампаніі. Беларускі ж бізнэс (калі ён увогуле існуе) да прыватызацыі допушчаны не будзе, ці ў яго проста не хопіць грошай. Тое ж самае і з насельніцтвам.

**Т.Шаклач, Мінск**

## УДАКЛАДНЕННЕ

Цэны гадзіннікаў Longines пачынаюцца ад 1000 еўра, а не ад 7000 еўра, як было напісана ў №36. Дзякуй Алесю Юшк. за ўдакладненне.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Галерэя «Ў»



НАСТАССЯ ШАМРЭЙ

На адкрыцці не абышлося без голага цела.

**Наватарская Галерэя сучаснага мастацтва адчынілася ў пункце прыёму шклатары.**

Сюды можна прыходзіць у кедах, а можна прыходзіць басанож. Можна прыходзіць з марозівам, а можна і без яго. Тут можна з разумным тварам разважаць пра сучаснае мастацтва, а можна круціць пальцам каля скроні. Галерэя сучаснага мастацтва! «Ў»!

— Калі я быў маленькім, у гэтым будынку быў прыём шклатары «Дыянісій». Бывала, і я сюды прыходзіў бутэлькі здаваць. А сёння буду тут вершы чытаць, — расказвае Віктар Жыбуль.

Галерэя сучаснага мастацтва адкрылася для сваіх прыхільнікаў увечары 7 кастрычніка. Зазывалы крычалі: «Хочаце прыходзьце, хочаце не прыходзьце. Можаце з разумным тварам разглядаць творы, а можаце хуценька пайсці ў бар». Ахвотных да сучаснага мастацтва хапала: і ў бары, і каля твораў-інсталяцый Сяргея Кірушчанкі. Кожная зала галерэі была бітком набіта.

У сваім вітальным слове дырэктар галерэі Кацярына Шатэрнік расказала пра ўнікальнасць гэтага месца: «Акрамя галерэі, у хуткім часе адкрыем тут кавярню і кнігарню. Каб людзям творчым і думаючым нічога тут не забаранялася і не было ніякіх табу».

Табу на адкрыцці галерэі заўважана не было.

Былі чытанні Пастарнака басанож на па-восеньску халодным асфальце, былі танцы аголенай дзяўчыны з прыкрытым шалікам тварам, былі і спевы Сяргея Пукста, падчас якіх некаторыя закрывалі вушы, а некаторыя шчасліва пляскалі ў далоні. І пакуль у адной зале гучаў акардэон пад умелымі рукамі музыкаў з гурту «Гурзуф», у другой зале беларускія літаратары чыталі вершы: пра маты, Радзіму, каханне і цыркулі.

Наведаць галерэю сучаснага мастацтва «Ў» можна ў любы дзень ад 10.00 да 22.00.

**Зайдзіце хаця б проста ў прыбіральню — там можна маляваць на сценах.**

З 8 кастрычніка можна паглядзець на персанальную выставу Сяргея Кірушчанкі Earth Art. 12 кастрычніка можна патрапіць на прэзентацыю кнігі Аляксандра Сапегі. 27 кастрычніка ў галерэі адбудзецца майстар-клас аўстралійскага музыканта, медыя-артыста Бэна Фроста. На гэтым этапе галерэю «Ў» падтрымалі інтэрнэт-правайдэр «Альтэрнатыўная лічбавая сетка» (брэнды «Атлант-тэлекам» і «Шпаркі дамавік»), а таксама Беларускі Народны Банк.

Калі няма прагі да сучаснага мастацтва, але будзеце праходзіць побач, зайдзіце хаця б проста ў прыбіральню — там можна маляваць на сценах. Адрас галерэі: праспект Незалежнасці, 37а, у двορыках за крамай «Том Тэйлар».

**Настасся Шамрэй**

**Галерэю «Ў» падтрымалі**

інтэрнэт–правайдэр «Альтэрнатыўная лічбавая сетка» (брэнды «Атлант–тэлекам» і «Шпаркі дамавік»), а таксама Беларускі Народны Банк.

# Перакладніца з нямецкай маўклівай на нямецкую гучную

**Лаўрэаткай Нобелеўскай прэміі па літаратуры за 2009 год стала Герта Мюлер — нямецкая пісьменніца, што нарадзілася ў Румыніі і стала пісьменніцай за Чаўшэску.**



«Яна глядзіць на гаспадароў палітыкі вачыма ахвяры», — напісалі нядаўна пра Герту Мюлер у нямецкай газеце «Цайт». І творы гэтыя — вершы, раманы і эсэ — «важная літаратурная вяха, голас сумлення ў часы ідэалагічнага тэрору, варожасці і прыгнёту».

Сёлета Нобель уручаны літаратурнай змагарцы за свабоду, летапісцу злыбедаў і няшчасцяў, якія толькі здаецца, што зніклі. Мюлер не сумняваецца, што ў хуткім часе нехта яшчэ, нехта на іншай зямлі зноўку апынецца пад прыгнётам... Толькі імёны душыцеляў і ідэалогіяў зменяцца.

Мюлер — падвойная ахвяра. Сотні гадоў таму вялікія групы немцаў іміґравалі ў Румынію і жылі там самастойнымі вясковымі супольнамі. Хай сабе двухмоўныя, але румынскія немцы жылі адасоблена, гетаізавана ад карэнных румынаў. Калі Герта нарадзілася ў 1953 годзе, гэтая меншыня была гнаная: румынскім немцам не было як вярнуцца на гістарычную Радзіму, бо камуністычны рэжым проста не дазваляў. Адзінае, чаму вучылася забытая і заняпалая грамада, — гэта мова страху і маўчання.

Мюлер парушыла гэтае маўчанне яшчэ дзеўчынай: акрамя сваёй асноўнай прафесіі перакладчыцы з нямецкай на румынскую, яна зрабілася перакладчыцай з маўклівай нямецкай на нямецкую гучную — пачала пісаць дзёрзкія вершы. Гэта не спадабалася «Секурытатэ», румынскаму аналагу савецкага КГБ: за вершы і за адмову супрацоўнічаць з паліцыяй яе звальняюць з працы, бязбожна цэнзуруюць вершы. Тады Герта зараблівала прыватнымі занятками па нямецкай мове. Толькі ў 1987 годзе ёй і яе мужу, таксама нямецкамоўнаму пісьменніку Рыхарду Вагнеру, дазволілі выехаць на гістарычную Радзіму.

**Проза Мюлер прасталінейная, нешматслоўная, празрыстая да непрыстойнасці. Эстэтычныя назіранні, моўныя эксперыменты яна прыхоўвае для паэзіі.**

У Нямеччыне хутка высветліла, што яна не можа пакінуць за спінаю варожасць і прыгнёт, і стуль яе паэзія і проза прысвячаюцца звычайнаму чалавеку ў надзвычайных, немагчымых становішчах, ва ўмовах палітычнай тыраніі. Так шмат хто з яе герояў — іміґранты з дэспатычнай Усходняй Еўропы: Ірэн з рамана «Падарожжы на адной назе» прыязджае ў Берлін з ананімнай усходнееўрапейскае краіны і мусіць даць рады не толькі свайму змрочнаму мінуламу, але таксама шэрай і лютай рэчаіснасці цывілізаванага Берліна.

У «Краіне зялёных сліваў» гераіня рамана — жанчына з нямецкай меншасці ў Румыніі, дакладна як сама Мюлер, што змагаецца за сваю культуру, спрабуе заручыцца падтрымкай сваіх супляменнікаў, але досыць хутка высвятляе іх вялікую сімпатыю да нацысцкага руху і вырашае вырвацца з праклятага краю, дзе ёй давялося нарадзіцца і жыць.

Або развагі пра свабоду ў апавяданні «Любоўнае спатканне», дзе галоўная гераіня, швачка, якая шые гарнітуры для мужчын на заштатнай тэкстыльнай фабрыцы таксама ананімнай, безаблічнай камуністычнай краіны. У кожную падбіўку гарнітура яна кладзе цыдулку, на якой напісана «Стань маім мужам», з надзеяй, што нехта злітуецца і вызваліць жанчыну ад яе незайздроснай долі.

Проза Мюлер прасталінейная, нешматслоўная, празрыстая да непрыстойнасці, яна хутчэй лушчэ, а не лашчыць чытача. Свае эстэтычныя назіранні, моўныя эксперыменты Герта прыхоўвае для паэзіі.

Дарма што ў Нямеччыне Мюлер атрымала прэстыжныя прэміі імя Франца Кафкі, яе раманы не зрабіліся бестсэлерамі. Але цяпер, пасля Нобеля, у немцаў і ў румынаў (дый не толькі ў іх) ёсць цудоўная магчымасць пачуць голас сумлення жывога, разумнага і, галоўнае, якое не забывае.

**Лявон К**

## СЦІСЛА

### У Мінск прывезлі Гальдоні і Талстую

IV Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва «Панарама» пачаўся ў Мінску пастаноўкай «Пінскай шляхты» паводле Дуніна-Марцінкевіча. Цягам месяца гледачы змогуць убачыць спектаклі па творах Шэкспіра, Талстой, Шміта, Астроўскага, Гальдоні. У «Панараме» бяруць удзел тэатры з Беларусі, Італіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Швейцарыі, Эстоніі.

### «Сучасны руска-беларускі слоўнік для школьнікаў»

выйшаў з друку. Ён адаптаваны да новых правілаў арфаграфіі.

### Новы тэатр адкрывае першы сезон

9 кастрычніка. Мінскі Новы драматычны тэатр (вул.Чайкінай, 16) вядзе сваю гісторыю ад студыі «Дзе-Я?», што ўзнікла ў другой палове 1980-х, а цяпер набыла статус дзяржаўнага тэатра і новую назву. Сёлета гледачы ўбачаць «Жанчыне не забароніш» Ануя, «Зацюканы апостал» Макаёнка.

**СМ; КМ**

# Калі не мы, то яны

8 кастрычніка ў пасольстве Літвы ў Мінску прайшла навуковая канферэнцыя «Прычыны пачатку Другой сусветнай вайны: роля камуністычнай і нацысцкай ідэалогій».

**Эдмінас Багдонас: «Калі мы не будзем гаварыць аб гэтым, то нехта скажа за нас».**



Быў прэзентаваны фільм «Расія ў вайне» і слайд-прэзентацыі, прысвечаныя параўнанню сталінізму і нацызму. З дакладамі выступілі журналіст, даследчык злачынстваў камунізму Андрэй Пачобут, кандыдат гістарычных навук Ігар Кузняцоў ды дэпутат літоўскага парламента Паўлюс Саўдаргас.

Удзельнічаў у канферэнцыі і пасол Літоўскай Рэспублікі Эдмінас Багдонас. Фармулюючы мэту сустрэчы, ён адзначыў: «Калі мы не будзем гаварыць аб гэтым, то нехта скажа за нас».

**АП**

# Нобелі-2009

### Медыцына: за раскрыццё працэсу старэння

Нобелеўскую прэмію ў галіне медыцыны і фізіялогіі атрымалі амэрыканскія даследчыкі Элізабет Блэкберн, Кэрал Грайдэр і Джэк Шостак.

Яны практычна раскрылі сакрэт старэння і працэс падзелу клетак чалавечага арганізма. Адкрыццё дазволіць даследаваць прыроду анкалагічных захворванняў, а таксама працэсу старэння чалавека.

Цікава, што тэарэтычна адкрыццё амэрыканскіх вучоных было абгрунтавана ў 1971 годзе савецкім даследчыкам Аляксеем Аўчыннікавым. Сам Аўчыннікаў не камэнтуе рашэння Нобелеўскага камітэта, аднак група расійскіх вучоных ужо выказала сваё абурэнне. Амэрыканцы адкідаюць абвінавачванні, заўляючы, што не знаёміліся з тэорыямі савецкага даследчыка.

Рашэнне Нобелеўскага камітэта можа абапірацца на жаданне самога Нобеля, якое прадугледжвала даваць прэміі менавіта за практычныя адкрыцці, а не за тэорыю. Сёлетняя прэмія ў галіне медыцыны стала юбілейнай — сотай.

### Фізіка: за оптаваланконны кабель і лічбавае фота

Нобелеўскую прэмію ў галіне фізікі атрымаў кітаец Чарльз Као і амэрыканцы Уіллард Бойл і Джордж Сміт.

Кітайскі фізік узнагароджаны за адкрыццё ў галіне перадачы інфармацыі з дапамогай оптаваланконнай тэхнікі. Као давёў, што магчымасць перадачы дадзеных залежыць толькі ад уласцівасцяў матэрыялу, з якога зробленыя оптаваланконны кабель.

Уіллард Бойл і Джордж Сміт атрымалі прэмію за вынаходніцтва тэхналогіі, на аснове якой працуе большасць матрыц сучасных лічбавых фота- і відэакамер. І лічбавая фатаграфія стала часткай штодзённага жыцця вялікай колькасці людзей.

### Хімія: за біялогію

Нобелеўскую прэмію па хіміі за 2009 год атрымалі Ада Ёнат з Ізраіля, брытанец індыйскага паходжання Вентакраман Рамакрышнан і амэрыканец Томас Стэйц. Яны зрабілі адкрыцці ў сфэры вывучэння структуры і функцый рыбасомы — часткі клеткі, якая сінтэзуе бялок. Кур'ёз у тым, што адкрыццё не мае дачынення да хіміі, хутчэй, належыць да біялогіі. Аднак Нобелеўскай прэміі ў галіне біялогіі не існуе, і было вырашана так уганараваць даследчыкаў.

За ўсю гісторыю ўручэння Нобелеўскай прэміі ў галіне хіміі толькі тры жанчыны сталіся лаўрэаткамі: Марыя Складоўская-Кюры ў 1911 годзе, яе дачка Ірэн Жаліо-Кюры ў 1935-м і Доракі Кроўфут у 1964-м. Такім чынам, Ада Ёнат стала чацвёртай жанчынай-хімікам, узнагароджанай Нобелеўскім камітэтам.

**АП**

## Артрыт на абцасах

Нязручны абутак у маладосці? Захворванні ног у старасці.



Пра гэта гавораць вынікі даследавання, надрукаванага ў Arthritis Care & Research. Хваробы ў ступаках і пальцах — адна з 20 самых распаўсюджаных прычын звароту да лекара ў пацыентаў 65—74 гадоў. Болі могуць суправаджацца сімптомамі рэўматычнага поліартрыту, цукровага дыябету, падагры, наступствамі расцягнення звязак, цягліц, удараў і пераломаў.

Для даследавання ўплыву абутку на ўзнікненне боляў у нагах даследчыкі са Школы здароўя ўніверсітэта Бостана даследавалі групу з 3372 чалавек ва ўзросце больш за 50 гадоў — 1472 мужчын і 1900 жанчын. Іх назіралі на працягу шасці гадоў.

Варта адзначыць, што ў Заходняй Еўропе абутак на абцасах менш пашыраны, чым у нас.

**НасБ**

## Цудадзейнасць ёгуртаў перабольшаная

Навукоўцы з Еўрапейскага органа харчовай бяспекі назвалі хлуснёй заявы пра карысць для арганізма прабіятычных напояў. Калі вы чулі пра ёгурты, якія падвышаюць імунітэт, вынішчаюць шкодных мікробаў і маюць іншыя гаючыя ўласцівасці, то ведаеце, пра што гаворка.

Сёлетнія навуковыя доследы 180 «карысных» дадаткаў не даказалі карыснасць ніводнага, піша Independent. Занадта доўга вытворцы несумленна гулялі на клопаце людзей пра сваё здароўе, падсумоўваюць навукоўцы.

Апроч таго, што несумленна, яшчэ і незаконна. Вось жа і кампанія Danone, якая працягвае настойваць на карыснасці сваіх прадуктаў, вядомых пад маркай Activia і DanActive, пагадзілася выплаціць па сто даляраў кожнаму спажыўцу, які абвінавацiў яе ў падмане. Фонд выплат — ажно 35 мільёнаў даляраў.

**cz**

## Самы стары продак чалавека



Ардыпітэк-саміца Арды. Здымак камп'ютарнай рэканструкцыі.

Аўстралапітэчку з імем Люсі скінулі з п'едэстала самага старадаўняга продка чалавека. Цяпер там усталявалі іншы від, ардыпітэка, ад саміцы, празванай Арды. Пра гэта піша часопіс Science.

Першыя парэшткі прадстаўнікоў роду ардыпітэкаў былі выяўлены ў Эфіёпіі ў 1992 г. Шкілет самой саміцы Арды знайшлі ў 1994 годзе. Навукоўцам спатрэбілася 15 гадоў, каб з вялікай асцярожнасцю выцягнуць косткі з зямлі і даследаваць. Выявілася, што Арды, якая жыла 4,4 мільёна гадоў таму, з'яўляецца адной з найстарэйшых з вядомых продкаў чалавека. Люсі ў параўнанні з ёй — дзяўчо: яна маладзейшая на 1,2 млн гадоў.

Па зямлі Арды перасоўвалася на задніх канечнасцях, а па дрэвах лазіла хутчэй, чым малпа. Вынаходка даводзіць, што ў эвалюцыі чалавека была доўгая пераходная стадыя, раней невядомая. Крытыкі ж кажуць, што Арды не папярэдніца чалавека, а прадстаўніца паралельнай галіны эвалюцыі.

**ЛК**



# Юбілей Пушчы

600 гадоў запаведнасці самага знакамітага беларускага лесу.

У свядомасці беларусаў Белавежа атаясамліваецца з веліччу. І нават новаўвядзенні, кшталту рэзідэнцыі Дзеда Мароза, не псуюць уяўленне аб старажытнай і слаўнай пушчы.

Пушчы ваколіц Гродна, Бельская, Камянецкая і Ваўкавыская некалі ўтваралі велізарны масіў. Сюды ў Сярэднявеччы ўцякалі ад вайсковай навалы і ад прыгону, тут абжываліся перасяленцы з іншых земляў. У гушчарах хаваліся апошнія яцвягі.

Людзі высякалі лес, адзіная пушча дзялілася. Ад XIV ст. яе частка стала асобнай, Белавежскай пушчай.

Ад часу ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага пушча ўваходзіць у яго склад як сапраўднае багацце. Тут нарыхтоўвалася сушанае мяса для выправы шматтысячнага войска на Грунвальд, ладзіліся ўрачыстыя паляванні вялікіх князёў. Адзін з іх, Ягайла, у 1409 г. надаў пушчы недатыкальны статус, забараніўшы там любыя паляванні. Натуральна, апроч вялікакняскіх.

Пасля Люблінскай уніі Польшча далучае Белавежу да сваёй тэрыторыі. Вільня траціць Падляшша назаўсёды.

### Пад уладай Кароны

Польскія каралі з ахвотай палявалі ў Белавежы. Мясцовым жыхарам забаранялася вольна карыстацца лясными багаццямі — была ўведзеная сістэма дазволаў, якія выдавалі спецыяльныя службы. Каралеўскія паляванні часам насілі вымушаны характар. Так, у 1426 годзе Ягайла з маладой жонкай Соф'яй хаваўся ў Белавежы ад пошасці, якая апанавала каралеўства.

У пазнейшыя часы паляваць у пушчы любілі Сцяпан Батура, Ян Казімір, Аўгуст III. Апошні праславіўся размахам. Захавалася сведчанне каралеўскай забавы: «Найяснейшы Аўгуст III кароль польскі паляваў тут разам з жонкай і сынам на зуброў і забіў іх 42, з якіх 11 вялікіх і 7 меншых, а таксама 18 зубрыц, а таксама 13 ласёў».

У часы Панятоўскага адміністратарам пушчы быў мадэрнізатар Антоній Тызенгаўз. Ён актыўна ўзяўся за інфраструктуру: абнавіў каралеўскія сядзібы і збудаваў канал, што злучыў рэкі Нарву і Нараўку... Аднак традыцыя каралеўскіх паляванняў знікла разам з Рэччу Паспалітай.

### У імпэратарскіх руках

Пасля падзелаў дзяржавы пушчай ніхто не апекаваўся. Векавыя багацці рабаваліся першымі-лепшымі гаспадарамі, якіх за грошы прызначала царыца Кацярына ІІ і яе сын Павел І. Толькі ў 1820 годзе імпэратар Аляксандр ІІ забараніў паляваць на зуброў і высякаць пушчу. Пра гэта пашкадаваў яго наступнік: у 1830-м жыхары пушчанскіх вёсак далучыліся да паўстання. Тая ж гісторыя паўтарылася ў 1863-м. У Белавежы базаваліся атрады Урублеўскага і, магчыма, знаходзілася друкарня «Мужыцкай праўды».

Традыцыя маштабных паляванняў адрадзілася ў пушчы ў часы Аляксандра ІІІ. Пушча набывае статус Імпэратарскага лесу. Сюды нават будуюць чыгунку, каб было зручней дабірацца з Пецярбурга. З Сібіры, Каўказа прывозілі сюды розныя пароды жывёл. Пушча зажыла абноўленым жыццём, поўным шумных забаваў.

Апошняе імпэратарскае паляванне адбылося ў пушчы ў 1912-м.

### Немцы, палякі, саветы... Беларусы

Ад 1914 года пачынаецца самы драматычны час у гісторыі Белавежы. Немцы, акупаваўшы палову Беларусі, пачалі вывозіць з пушчы яе багацце.Было высечана 5 з 32 мільёнаў кубамэтраў драўніны. Потым былі некалькі гадоў анархіі, калі кожны рабіў у пушчы, што хацеў. У выніку апошні мясцовы зубр быў забіты ў 1919 годзе. У 1920 г. пушча перайшла ў рукі Польшчы. Зуброў наноў завезлі ў 1929 годзе.

Пасля Другой сусветнай вайны пушчу ўпершыню падзялілі між дзвюма дзяржавамі. У савецкай Беларусі яна была дзяржаўным запаведнікам, і партыйныя босы часцяком сюды наведваліся. Знакамітыя на ўвесь свет Віскулі, пабудаваныя ў 1950-я гады, якраз былі ціхай пушчанскай рэзідэнцыяй, дзе можна было адпачыць ад унутрыпартыйных войнаў. У гэтых самых Віскулях і скончыў сваё існаванне 8 снежня 1991 года Савецкі Саюз.

У незалежнай Беларусі пушча набыла статус нацыянальнага парку, а ад 1992 г. старажытны лес уключаецца ў спіс Сусветнай Культурнай Спадчыны ЮНЭСКА.

Пачатак новага тысячагоддзя прынёсіць мноства праблем. Злыя языкі пагаворваюць аб пазбаўленні міжнароднага статуса праз сістэматычную высечку лесу.

600 гадоў — тэрмін вялікі. Нават для Белавежскай пушчы. Добра ўжо тое, што яна яго перажыла. Будзем спадзявацца, што самыя непрыемныя часы ў яе гісторыі мінулі і Белавежу чакае росквіт. З народзінамі, Пушча!

**Алесь Пілецкі**

# Чалавек, якога не было

45 гадоў таму знялі Хрушчова. Піша **Віталь Тарас**.



Апошнім часам усё больш размоваў, публікацый, фільмаў і тэлеперадач прысвячаюцца Сталіну. Пра яго гавораць як пра «эфектыўнага менеджэра», згадваюць яго ролю ў Вялікай Айчыннай вайне. А вось Хрушчова, які развянчаў культ Сталіна, амаль не ўспамінаюць.

Працэс забыцця пачаўся пры Брэжневе. 14 кастрычніка 1964 года адбыўся пленум ЦК КПСС, які зняў з пасады першага сакратара Хрушчова. Па сутнасці, гэта быў дзяржаўны пераварот, арганізаваны партыйнай наменклатурай, якая даўно марыла скінуць «дарагога Мікіту Сяргеевіча». Адправілі чалавека на пенсію (дзякаваць Богу, не ў турму) і зрабілі выгляд, як быццам яго і не было. Напрыклад, кінахроніку, у якой Гагарын ідзе пра Краснай плошчы і рапартуе пра свой палёт у космас, паказвалі ў скарочаным выглядзе: выразалі кадры з Хрушчовым, да якога той рапарт быў звернуты...

Засталося хіба слова «хрушчоўка»...

### Хамская ўлада

Увосень 1964 года я пайшоў у першы клас. Некаторыя тагачасныя размовы дарослых памятаю. Напрыклад, пра тое, што цяпер, калі ў краіне будуць два кіраўнікі — генсек Брэжнеў і старшыня Савета міністраў Касыгін (Хрушчоў гэтыя дзве пасады сумяшчаў), адбудуцца змены да лепшага, стане больш свабоды. Тыя размовы мне нагадваюць цяперашнія развагі ў Расіі пра тандэм Пуцін-Мядзведзеў.

Чамусьці інтэлігенцыя напачатку ўскладала вялікія спадзяванні на Касыгіна, хоць, як мы ведаем, быў ён тыповым сталінскім воўкам, які крочыў па трупах. Як, дарэчы, і Хрушчоў.

Хрушчоў вырас у беднай сям'і, пачатковую школу наведваў ад выпадку да выпадку. З чатырнаццаці гадоў працаваў шахцёрам у Данбасе і сапраўднай адукацыі за ўсё жыццё так і не атрымаў. Займаючы галоўную пасаду ў ракетна-ядзернай дзяржаве, Хрушчоў заставаўся цёмным чалавекам. Карыстаючыся яго невуцтвам, вакол яго асобы круціліся прайдзісветы і махляры ад навукі. Самы вядомы з іх — акадэмік Лысенка, які пры Сталіне разграміў савецкую генетыку і фізічна знішчыў многіх біёлагаў, у тым ліку выдатнага селекцыянера Мікалая Вавілава. Лысенка заставаўся ў фаворы і пры Хрушчове.

А вось яго дачка Рада Аджубей была вельмі адукаванай і інтэлігентнай жанчынай. Шмат гадоў яна рэдагавала часопіс «Наука и жизнь». (Зяць Хрушчова Аджубей быў галоўным рэдактарам «Известий».) Эканаміст Мікалай Шмялёў, які таксама быў сваяком Хрушчовых, успамінаў такі эпізод. Хрушчоў прыйшоў дамоў пасля працы раззлаваны. Нехта яму даклаў, што яўрэі прыдумалі хітрую навуку — разводзяць і вывучаюць мух у лабараторыях. Шмялёў з дапамогай Рады спрабаваў Хрушчову патлумачыць, што законы спадчыннасці ў прыродзе можна, канечне, вывучаць і на сланах, але на мушках-дразафілах усё ж зручней і танней. А яўрэі тут увогуле ні пры чым. Генетык Вавілаў, напрыклад, быў рускі. Хрушчоў набрыняў крывёй, грукнуў кулаком па стале і пачаў крычаць: «Дразафілы! Жыды! Дразафілы!Жыды!...»

Ён неадноўчы публічна крыў матам пісьменнікаў на нарадах у Крамлі, на выставе ў Манежы мастакоў-нефармалаў называў «підарасамі» і «абстракцыстамі». Адзін з тых «абстракцыстаў» — скульптар Эрнст Неізвестный, дарэчы, стане аўтарам славутага помніка на магіле Хрушчова.

### ХХ з'езд

Кім-кім, але дурнем Хрушчоў не быў. А інакш не перамог бы Берыю, а потым іншых сталінскіх ваўкоў — Молатава, Малянкова, Кагановіча. Пры Сталіне яго трымалі за блазна, смяяліся з яго. Ён быў тоўсты і нязграбны (вынік перанесенай у маладосці хваробы). Сябры па палітбюро лічылі яго недалёкім. І пралічыліся.

Палітолаг Андрэй Піянткоўскі, гаворачы пра вядомы артыкул Дзмітрыя Мядзведзева ў інтэрнэце, у якім той крытычна ацэньвае сучасны стан Расіі, іранічна заўважае: уявіце сабе, што Хрушчоў зачытвае свой славуты антысталінскі даклад на з'ездзе партыі, а ў прэзідыуме сядзіць таварыш Сталін. Гэта пра тое, што Пуцін, на якім таксама ляжыць поўная адказнасць за сітуацыю ў краіне, рычагі ўлады выпускаць з рук не збіраецца.

На ХХ-м з'ездзе ў прэзідыуме, варта памятаць, сядзелі тыя самыя Молатаў, Малянкоў, Кагановіч, а таксама Варашылаў, Булганін, іншыя верныя сталінцы.

Пасля смерці правадыра тады прайшло менш за тры гады. Дэлегатам з'езда не трэба было тлумачыць, што такое сталіншчына. Сваякі і знаёмыя многіх пацярпелі ад рэпрэсій. Таму казаць, быццам яны не ведалі таго, пра што гаварылася ў дакладзе, было б гэтак сама наіўна, як сцвярджаць, быццам члены НСДАП ў Германіі не ведалі пра злачынствы Гітлера. Іншая справа, што пра сталінскія злачынствы нельга было гаварыць. Хрушчоў не проста парушыў табу, ён прыводзіў факты і дакументальныя сведчанні, і ўсё гэта заносілася ў пратакол з'езда. А тое, што прыхільнікі Сталіна ўсё гэта выслухалі і не пярэчылі, ставіла іх у безвыходнае становішча. Хто не з першым сакратаром — той супраць лініі партыі.

Крытыка Сталіна Хрушчовым мела абмежаваны характар. Прыклады рэпрэсій, якія ён прыводзіў у дакладзе, тычыліся партыйных работнікаў і савецкіх кіраўнікоў рознага рангу. Менавіта тады нарадзіўся папулярны міф, нібыта пры Сталіне «адстрэльвалі начальства».

### Лібералізацыя

Казаць пра тое, што масавы тэрор пачаўся яшчэ пры Леніне, што ахвярамі рэпрэсій сталі мільёны сялян, рабочых, амаль уся інтэлігенцыя, Хрушчоў не хацеў.

Але галоўным вынікам ХХ з'езда было тое, што мільёны незаконна асуджаных выйшлі на свабоду. Толькі ў Беларусь у 1956 годзе з лагераў вярнуліся каля 30 тысяч чалавек. У іх ліку Ларыса Геніюш, Сяргей Грахоўскі, Станіслаў Шушкевіч, іншыя дзеячы беларускай культуры.

Адбылася рэабілітацыя народаў, рэпрэсаваных Сталіным падчас вайны — калмыкаў, карачаеўцаў, чачэнцаў. Але ўзмацнілася і русіфікацыя. Яе падштурхнула вядомая фраза, кінутая Хрушчовым падчас паездкі ў Мінск у 1959-м годзе: «Чым хутчэй мы пачнем гаварыць па-расійску, тым хутчэй пабудуем камунізм».

Лібералізацыя рэжыму, якую тады называлі «адлігай», не зашкодзіла Хрушчову патапіць у крыві нацыянальнае паўстанне ў Венгрыі ў лістападзе 1956-га.

Хрушчоў быў перакананым камуністам, а значыць — ваяўнічым бязбожнікам. Пры ім узмацніўся наступ дзяржавы на рэлігію.

Пры Хрушчове сяляне нарэшце атрымалі пашпарты. Але ўздыхнуць з палёгкай ім не далі. У выніку барацьбы з «прыватнаўласніцкімі інстынктамі» яны былі вымушаны высякаць свае сады (бо за кожнае дрэўца трэба было плаціць падатак), рэзаць авечак і коз, якіх забаранілі мець у хатняй гаспадарцы. Можна было трымаць толькі адну карову і адну свінню. А памер прысядзібнага ўчастка абмежавалі 35 соткамі.

### Іншая гісторыя

Хрушчова знялі «за валюнтарызм». Але ў народзе гэтага слова не ведалі. У анекдотах яго называлі «хрушч», «тля кукурузная». І гэта было яшчэ самае мяккае.

Між тым, узровень жыцця ў гарадах на пачатку 1960-х значна ўзрос.

У савецкіх людзей упершыню з'явіўся вольны час, магчымасць ездзіць па краіне і адпачываць. Можна было, напрыклад, пасядзець з кампаніяй ля вогнішча, спець пад гітару, распавесці анекдот, не баючыся рэпрэсій.

Ідэалагічная вайна пры гэтым, канечне, не спынялася ні на дзень — партыя змагалася са стылягамі, марнатраўцамі, адшчапенцамі.

У замежнай палітыцы праціўгалася «халодная вайна», якая ў выніку ракетнага крызісу на Кубе ледзь не скончылася «гарачай» — тэрмаядзернай вайной.

Да гэтага Хрушчоў стаў першым савецкім кіраўніком, які наведаў Злучаныя Штаты. І хаця Захад не без падставаў пабойваўся савецкага лідэра, асабліва, калі ён заяўляў, «што сацыялізм закапае капіталізм», усё-такі заходнія журналісты разгледзелі ў ім жывога чалавека. Гэта пазней пацвердзяць і мемуары Хрушчова, надыктаваныя ім на магнітную стужку і тайна вывезеныя на Захад. Там ён выклікаў хутчэй сімпатыі ў шырокай публікі.

Нешта падобнае адбудзецца праз трыццаць гадоў з Гарбачовым.

Як і Хрушчова, яго ўзненавідзіць не толькі наменклатура, але і народ. Адраджэнне сталінізму пры Брэжневе пачалося не з пастановаў партыі, а з партрэтаў правадыра за шклом у кіроўцаў грузавікоў. Інтэлігенцыя лічыла, што так адбывалася, бо народ нічога не ведаў пра злачынствы Сталіна. Сёння сказаць так ужо няможна. Шмат чаго вядома.

Але чаму народ любіць дыктатараў і не любіць тых, хто дае свабоду — гэта ўжо зусім іншая гісторыя.















ПЫТАЙЦЕСЯ ВЫДАННІ СЕРЫІ «КНІГАРНЯ «НАША НІВА»

# «Арлекін» і «Зязюльчына гняздо» на сцэне Купалаўскага

**У Мінску праходзіць файны тэатральны фестываль «Панарама».**

У Мінску пачаўся тэатральны фестываль «Панарама». Ужо амаль скончылася беларуская частка, а нас чакае яшчэ міжнародная праграма. Спектаклі іншаземных тэатраў будуць праходзіць часам на нацыянальных мовах, аднак гледачы зразумеюць усё, што адбываецца на сцэне, дзякуючы сінхроннаму перакладу або субтытрам.

**16 і 17 кастрычніка.** Лаўрэат еўрапейскай прэміі «Новая тэатральная рэальнасць» рэжысёр Алвіс Херманіс са сваім Новым рыжскім тэатрам прадставіць меладраму з пераапрананнем «Соня» паводле бурлескных апавяданняў Тацццяны Талстой.

**19 кастрычніка.** «Пралятаючы над гняздом зязюлі» Кена Кізі. Уладальнік прэстыжнай «Залатой маскі» Башкірскі дзяржаўны акадэмічны тэатр драмы імя Мажыта Гафуры. **Пачатак а 19-й.**

**22 кастрычніка.** Тэатр Аскараса Каршуноваса пакажа шэкспіраўскі «Сон у летнюю ноч». **Пачатак а 19-й.** Аскарас Каршуновас — адзін з самых вядомых маладых рэжысёраў Еўропы, уладальнік тэатральных прэміяў на Эдынбургскім і Рыжскім фестывалях.

**24 кастрычніка.** Драматычны тэатр імя Пушкіна (Магнітагорск) пакажа расійскую класіку паводле Астроўскага «Навальніца». **Пачатак а 19-й.**



Спектакль «Соня». Пастаноўка Новага рыжскага Тэатра.

**25 кастрычніка.** З больш экзатычных краінаў: на фестывалі выступіць тэатр Gota Dulce з Венесуэлы. Пастаноўка «Гоцін... уся рэч у міры».

**27 кастрычніка.** Не абыдзецца і без прыўкраснай панарамаўскай завядзёнкі: канцэрт гуртоў, якія складаюцца з артыстаў драматычных тэатраў, «Тэатральны саўнд». Удзельнічаюць: «Срэбнае вяселле», «Дзецідзяцей», Naka, Malanka-orchestra ды іншыя. **Пачатак а 19-й.**

**31 кастрычніка.** Закрые праграму спектакль «Арлекін — служка двух гаспадароў» міланскага тэатра Piccolo Teatro di Milano, якому сусветную вядомасць прынёс заснавальнік — слынны тэатральны рэжысёр і драматург Джорджа Стрэлер. Рэдкі прыклад праўдзівага тэатральнага чараўніцтва, спектакль «Арлекін», жыве сваім жыццём ад часоў стварэння тэатра, зазнаўшы шматлікія аднаўленні і мадыфікацыі. Да 1961 роль Арлекіна выконваў вялікі Марчэла Марэці, а пасля яго смерці ў 1963 — Феруча Салеры, чые дасціпныя і пластычна віртуозныя трукі ўвайшлі ва ўсе тэатральныя хрэстаматыі свету. **Пачатак а 12-й і 19-й.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Расійцы зрабілі кавер на «Чароўнага трусіка»

Юра Дземідовіч, праспяваўшы толькі адну песню, «Чароўны трусік», напоўніцу спажывае зорны плён: спярша быў запрошаны разаграваць Prodigy (толькі ўмовы кантракта з «Белтэлерадыёкампаніяй» не дазволілі яму зрабіць гэта), а цяпер ён даслужыўся і да кавер-весіі свайго хіта.

Нашаму «Трусіку» даніну пашаны аддалі расійцы: у сваёй уласцівай перапеўна-іранічнай форме Дземідовічаў опус перапяяла напаўжартлівая рок-сямёрка НестройBand, членам якой з'яўляецца рэзідэнт «Камеды-клаб» Ігар Элвіс Мерсон.

У кліпе да кавера саліст НестройBand'а Сева Масквін грымаснічае, намагаючыся ўдаць беларускага спевака. Першая частка песні зроблена ў стрыманым стылі, а ў другой прысутнічаюць металічныя запілы.

Тым жа часам першапачатковую версію песні «Чароўны трусік» ў сеціве ўжо пабачыла 400 тысяч чалавек (і гэта толькі па адным канале).

**ЛК**

## ВЫСТАВЫ

### Шаўковае сэрца

**У выставачнай зале бібліятэкі імя Пушкіна (вул.Гікалы, 4) з 16 кастрычніка да 22 лістапада будзе** працаваць выстава аўтарскай лялькі «Шаўковае сэрца». На выставе можна будзе ўбачыць не толькі лялькі беларускіх майстроў, але і лялькі з Расіі, Украіны і Азербайджана.

### Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 18 кастрычніка** працуе выстава Сяргея Плыткевіча «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы».

### Польскае выяўленчае мастацтва XVIII—XX стагоддзяў

**Да 2 лістапада ў Мастацкім музеі** будзе працаваць выстава «Польскае выяўленчае мастацтва другой паловы XVIII — першай паловы XX стагоддзя» са збораў музея.

### Паміж небам і зямлёй

**Ад 16 кастрычніка да 7 снежня ў Мастацкім музеі** будзе працаваць выстава скульптуры Андрэя Вераб'ёва «Паміж небам і зямлёй».

### Казачная краіна

**У кінатэатры «Перамога» (вул. Інтэрнацыянальная, 20) ад 16 кастрычніка да 10 лістапада** будзе працаваць фотавыстава «Казачная краіна», прымеркаваная да нацыянальнага свята Чэхіі — 28 кастрычніка. Фотаздымкі адлюстроўваюць свет легенд, звязаных з цэлым шэрагам мясцін Прагі і дазваляюць адчуць дотык магіі.

### Тэхна-арт. Жалеза

**Да 18 кастрычніка ў галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл, 1)** працуе выстава серыі праекта «Тэхнаарт». «Жалеза» будзе прадстаўленае працамі Уладзіміра Цэслера, Вадзіма Качана, Андрэя Шчукіна і многіх іншых.

### Выстава адной «Мадонны»

**Да 30 кастрычніка ў Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20)** будзе працаваць выстава адной карціны. Гэта твор італьянскага жывапісца Парыса Бардонэ «Мадонна з дзіцем, святым Энрыка з Упсалы і святым Антоніа Падуанскім» з калекцыі Музея правінцыі Бары (Італія).

### Апосталы Гервят

**У галерэі касцёла Св. Сымона і Св. Алены 15 кастрычніка** пачынае працу выстава Валерыя Вядрэнкі «Апосталы Гервят». Выстава з'яўляецца вынікам двухгадовай працы над матэрыялам фатаграфавання касцёла Св. Троіцы ў в.Гервяты Астравецкага р-на. Экспазіцыя складаецца з дзвюх частак. У першай аўтар знаёміць гледача з мясцовасцю, касцёлам і яго інтэр'ерам. Другая частка выставы прадстаўляе фотапластычную кампазіцыю на тэму вобразаў Евангелля.

### 1989-2009: Зменлівы свет — адбіты час

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 25 кастрычніка** працуе выстава сучаснага фота- і відэамастацтва. Выстава была задумана ў сувязі з дваццацігадовай гадавінай падзення Берлінскага мура. На выставе можна ўбачыць фатаграфіі і відэапрацы шаснаццаці аўтараў з васьмі краін, згрупаваныя па чатырох важных тэмах: сям'я, самаідэнтыфікацыя, урбанізацыя і палітыка.

## ІМПРЭЗЫ

### Бутэлькі Дзмітрыя Строцава

**У Палацы мастацтва (вул. Казлова, 3) 16 кастрычніка (пятніца)** адбудзецца прэзентацыя кнігі Дзмітрыя Строцава «Бутэлькі свету». Бяруць удзел: Зміцер Вішнёў, Міхаіл Ганчароў, Галіна Дубянецкая, Вольга Елінеўская, Алена Казанцава, Марына Куноўская, Марыйка Мартысевіч, Ігар Палевікоў, Мікалай Раманоўскі, Дзіна Сеннікава, Людка Сільнова, Дзмітры Строцаў, Віка Трэнас, Андрэй Хадановіч. Уваход вольны. **Пачатак а 18-й.**

## КАНЦЭРТЫ

### Рок па вакацыях

**23 кастрычніка ў «Рэктары» (вул.В. Харужай, 29)** — «Рок па вакацыях». Бяруць удзел: **«Ляпіс Трубяцкой», Neuro Dubel, «Крама»** Спецыяльна запрошаныя госці: **Drum Ecstasy, «Авангард-школа». Пачатак а 18-й.**

### The UNB

**24 кастрычніка ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — The UNB. **Пачатак а 19-й.**

## КІНО

### Французскія дакументальныя фільмы пра фатаграфію

У **канферэнц-зале Мінскай абласной бібліятэкі імя Пушкіна (вул.Гікалы, 4)** будуць дэманстравацца французскія дакументальныя фільмы пра фатаграфію. **Пачатак а 19-й. 15 кастрычніка:** «Фотарэпарцёры», «Фатаграфія і мода». **20 кастрычніка:** «Анры Карцье- Брэсон. Біяграфія аднаго погляду». **21 кастрычніка:** «Фатаграфія і навука», «Фатаграфія ню». **22 кастрычніка:** «Фотааматары», «Рынак фатаграфіі».

## ТЭАТРЫ

### 15 кастрычніка

**Тэатр імя Горкага** — «+1 (плюс адзін)»
**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»
**Музычны тэатр** — «Марыца»

### 16 кастрычніка

**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэрак»
**Тэатр оперы і балета** — «Баядэрка»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»

### 17 кастрычніка

**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Музычны тэатр** — «Шапеніяна»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

### 18 кастрычніка

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка»
**Музычны тэатр** — «Магія любові»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Купалаўскі тэатр** — Праект «Тэатр On-line»: «Хто Я?»

### 19 кастрычніка

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Купалаўскі тэатр** — «Палёт над гняздом зязюлі» (Башкірскі акадэмічны тэатр драмы)

### 20 кастрычніка

**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Тэатр юнага гледача** — «Маленькія трагедыі»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»

### 21 кастрычніка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Музычны тэатр** — «Баядэра»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

### 22 кастрычніка

**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Купалаўскі тэатр** — «Сон у летнюю ноч» (Тэатр Аскараса Каршуноваса)
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

### 23 кастрычніка

**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Шлях у Царград»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»

### 24 кастрычніка

**Музычны тэатр** — «Залатое кураня»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»
**Музычны тэатр** — «Прынцэса цырка»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр юнага гледача** — «Мешчанін у дваранстве»

## КІНААФІША

## «Русалачка» для дзетак ад Хаяа Міядзакі




**Рыбка Понія на выспе**
(Gake no ue no Ponyo)
Японія, 2008, 100 хв.
Рэжысёр: **Хаяа Міядзакі**
Жанр: **Анімэ для ўсёй сям'і**
Адзнака: **7 (з 10)**

Маленькая, але цікаўная рыбка Понія, дачка падводнай феі, любіць назіраць за людзьмі. Аднойчы яе выратоўвае хлопчык Сузукі, які ўпадабаў яе. Понія марыць стаць маленькай дзяўчынкай, але гэта не падабаецца ейнаму бацьку — злому марскому чараўніку.

Пяшчотны і крохкі фільм Хаяа Міядзакі — гэта «Русалачка» для пяцігадовых, залюляная японскай магіяй і нястрашнымі цудамі. Творы Хаяа Міядзакі — шматпланавыя, дзівосныя і глыбока філасофскія, даступныя і для дарослых, і для дзяцей.

У адрозненне ад іншых фільмаў («Знесеныя прывідамі», «Прынцэса Мананоке») — карціна «Рыбка Понія» амаль беспраблемная, крыху саладжавая і вельмі простая. Але гэта не адмяняе шчаснай анімацыйнай радасці: мядузы гушкаюцца ў вадзе, хіпушны чараўнік швэндаецца па сушы, а дзяўчынка пад «валькірыйную» музыку бяжыць па хвалях.

У падводным свеце з важным выглядам дэфілююць дапатопныя рыбы, на зямлі дасціпныя бабкі ўспамінаюць цунамі дзён мінулых.

Для дзетак самае тое.

Кампазітар Джое Хісаішы атрымаў узнагароды за музыку да фільма, а Міядзакі з «Рыбкай» намінаваўся на «Залатога льва» Венецыянскага фэсту.

З 12 да 18 кастрычніка карціна дэманструецца ў мінскіх кінатэатрах «Піянер» і «Аўрора».

**Андрэй Расінскі**

# Граф вярнуўся

**Дзесятак гадоў таму пра гэтага выбітнага фатографа ведалі ў Беларусі адно чытачы «НН». Сёння ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры ідзе ўнікальная выстава фотаў Бенедыкта Тышкевіча.**

Менавіта нашыя публікацыі паспрыялі таму, што гэтае імя заўважыў Юрый Васільеў, куратар музея-галерэі «Свет фота». Спадар Васільеў, заслужаны работнік культуры Беларусі, разам з французскімі дыпламатамі зрабіў вялізарную арганізацыйную работу дзеля таго, каб у Нацыянальным гістарычным адкрылася ўнікальная выстава.

Яна адметная не толькі тым, што абсалютная большасць адмыслоўцаў бачаць гэтыя творы ўпершыню, але і тым, што гэта трэцяя іх выстава наогул.

Арыгіналы гэтых фатаграфіяў выстаўляліся толькі адзін раз у Францыі ў 1994 годзе. У 1999 годзе выстава ягоных твораў адбылася ў Вільні. Гэта была сапраўдная сенсацыя. Большасць з фотаў прысвечаная беларускім народным тыпажам канца XIX ст. А выставу зрабіў Музей фатаграфіі горада Шалон-сюр-Сон — гэта ў Францыі, дзе Бенедыкт Тышкевіч правёў свае апошнія гады (ён дажыў да 1935 года).

Калекцыя фатаграфіяў Бенедыкта Тышкевіча перахоўваецца ў тамтэйшым музеі Нісефора Ньепса. У 1993 годзе гэты музей выпадкова набыў у парыжскага антыквара цудам ацалелы альбом фатаграфіяў Тышкевіча: 86 адбіткаў на кардоннай аснове, якія зафіксавалі разнастайныя мясціны і людзей Беларусі, Францыі і Італіі. Увогуле, архіў Тышкевіча згарэў яшчэ ў часе Першай сусветнай вайны. Гэткі ж лёс напаткаў і калекцыю твораў мастацтва, што захоўвалася ў ягоным беларускім маёнтку Вялае (ці Вялава), што на Івянеччыне. Ад усяго, імаверна, застаўся толькі гэты альбом. І вось, нарэшце, гэтая рэліквія зноў у Беларусі. Пасля стагоддзя забыцця граф вярнуўся ў родны край.

Бенедыкт Тышкевіч нарадзіўся ў Немежы, што літаральна на самай цяперашняй беларуска-літоўскай мяжы. Маёнткі меў па ўсім свеце, у тым ліку і ў Налібоцкай пушчы. Тышкевіч быў заможным арыстакратам, які атрымаў у спадчыну розныя аб'екты нерухомасці і капітал, але не гэтак баляваў-паляваў, як занурваўся ў пытанні этнаграфіі, археалогіі і лінгвістыкі.



Ён стаў адным з першых у свеце майстроў фатаграфіі. Ён арандаваў караблі, каб вандраваць, аб'ехаў Індыю, Кітай, Японію.

Свае найлепшыя здымкі ён экспанаваў на выставе ў Філадэльфіі, у Амерыцы (1876), дзе і атрымаў за іх свой першы медаль. Няцяжка падлічыць, колькі часу прайшло ад вынаходніцтва фатаграфіі наогул. У здымках Тышкевіча выявіўся адначасна і мадэрнізм, і рамантызм творцы. Ён адчуваў адказнасць перад кожным адбіткам — сярод іх няма выпадковых. Складанасць нечаканых кампазіцый сведчыць аб вялікім прафесіяналізме. Ягоныя творы — сапраўдныя шэдэўры беларускай фатаграфіі. З іх на нас глядзяць і вяскоўцы, і местачкоўцы, і рамеснікі. Фатаграфіі сялянаў і вясковых прыгажунь у строях таго часу, у натуральным асяроддзі — гэта сведчанне адкрытага светапогляду і ўважлівага вока Тышкевіча. Тут і здымкі ягонага палацавага побыту, і інтэр'еры вясковых хат і корчмаў, стылёвыя будуары, сядзібы і кухні, вясковыя сцэнкі і партрэты сваякоў. Ён увасобіў у фота найважнейшыя характарыстыкі Беларусі і беларусаў таго часу.

У 1883 годзе, калі памірае жонка, граф з трыма дзецьмі пераязджае ў свае французскія маёнткі. Назаўжды. Ён уладкоўваецца ў сваім маёнтку ў шыкоўным прыгарадзе Парыжа Нэі і цалкам прысвячае сябе фатаграфіі. З таго часу ягоная сувязь з родным краем абарвалася. Графа Тышкевіча пахавалі ў Ніцы ў сямейнай пахавальнай капліцы.

Але ягоныя фота, зробленыя больш за сто гадоў таму ў Беларусі, ізноў вярнуліся да нас. У гэта і зараз цяжка паверыць. Але паверце — гэта наша сапраўдная класіка.

**Сяргей Харэўскі**

**Выстава графа Бенедыкта Тышкевіча**

будзе экспанавацца ў Нацыянальным гістарычным музеі (Мінск, Маркса,12) да 29 кастрычніка. Пасля выстава пераедзе ў Гомель, у Галерэю імя Вашчанкі (4—17 лістапада), а затым у Полацк, у галерэю Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (20 лістапада — 8 снежня).

ТЭЛЕПРАГРАМА НА 19—25 КАСТРЫЧНІКА

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 19 кастрычніка, панядзелак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** Дакументальная гадзіна: «Беларускі фронт, альбо Размовы пра мову», дак. фільм, рэж. Віктар Корзун, 2007 г., Беларусь
**19:55** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Госць «Белсата»: Лявон Баршчэўскі
**20:40** Беларусы ў Польшчы
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** «Несвядомыя», маст. фільм, рэж. Хаакін Арыстрэль, 2004 г., Іспанія—Нямеччына—Партугалія—Італія.
**22:10** Аб'ектыў

### 20 кастрычніка, аўторак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** МакраФон: «Рок-карона—2008», ч. 2
**19:40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20:10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20:40** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крэўская унія» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, рэж. Антон Цялежнікаў, 2009 г., Польшча, ч. 2
**22:10** Аўтастопам праз Еўропу, 6 серыя: Мілан
**22:30** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**22:45** Маю правы (прававая праграма)
**23:00** Аб'ектыў

### 21 кастрычніка, серада

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**19:40** Форум (ток-шоу): «Мастак і час»
**20:30** Рэпарцёр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Рагвалод і Рагнеда» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 29 серыя
**22:25** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 22 кастрычніка, чацвер

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 23 серыя
**19:35** YoLife! (моладзевая праграма)
**20:00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** «Бульбаны», мультсерыял: «Запіс у БРСМ»
*Дырэктар школы, дзе вучыцца Віця Бульбан, прапагандуе далучэнне да Беларускай партыі. Ён расказвае вучням, што сябрам партыі не трэба думаць, а толькі выконваць даручэнні, бо думаць за іх будзе прэзідэнт. Ён падкрэслівае, што ў тых, хто адмовіцца ўступіць у партыю, будуць праблемы. Сатырычнае бачанне працэсу ідэалагізацыі моладзі.*
**20:40** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 16 серыя: «Еўрафермеры»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Плямёны» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял: 3 серыя
**22:25** Без рэтушы: «Новае жыццё», рэпартаж, 2009 г., Польшча
**22:40** Аб'ектыў

### 23 кастрычніка, пятніца

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Аблавушак», мультсерыял
**19:15** «Ваўчыная маці», дак. фільм, рэж. Халіна Ачкасова-Казлоўска, 2007 г., Польшча
**19:50** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, рэж. Антон Цялежнікаў, 2009 г., Польшча, ч. 3
**20:40** Госць «Белсата»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** «Парнаграфія», маст. фільм, рэж. Ян Якуб Кольскі, 2003 г., Польшча.
**23:20** Аб'ектыў

### 24 кастрычніка, субота

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Аблавушак», мультсерыял
**19:10** Аўтастопам праз Еўропу, 7 серыя: Прага
**19:25** МакраФон: канцэрт гурту «Ляпіс Трубяцкой» на цырымоніі ўручэння прэміі «Рок-каранацыя—2008».
**20:00** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Клім Смаляціч і Аўрам Смаленскі» (спазнаваўчая праграма)
*У XII ст. Смаленск быў на піку свайго развіцця, не толькі палітычнага, але і культурнага. Смаленскае княства стала адным з найважнейшых цэнтраў на ўсходнеславянскіх землях. Тады і набылі шырокую вядомасць імёны Кліма Смаляціча і Аўрама Смаленскага.*
**21:20** Суботні сеанс: «Змоўкні!», маст. фільм, рэж. Франсіс Вебер, 2003 г., Францыя. У ролях: Жэрар Дзепардзье, Жан Рэно.
**22:50** Аб'ектыў (паўтор)

### 25 кастрычніка, нядзеля

**19:05** «Аблавушак», мультсерыял
**19:10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19:25** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 2 серыя
**20:00** Форум (ток-шоу): «Веравызнанне ў Беларусі»
*27 чэрвеня 2002 г. палата прадстаўнікоў прыняла новую рэдакцыю закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». З гэтага моманту баланс у дачыненнях паміж дзяржаваю і канфесіямі парушыўся. Незадаволенасць новым законам прывяла да таго, што ў 2007—2008 гг. былі сабраныя 50 тыс. подпісаў за змену гэтага акту. Што не задавальняе падпісантаў?*
*Упершыню з савецкіх часоў за кратамі апынуліся святары, якія праводзілі багаслужбы без дазволу мясцовых органаў улады... За апошнія 5 гадоў шмат хто з ксяндзоў мусіў пакінуць Беларусь, бо ўлады адмовіліся працягнуць ім візы... З 2002 г. змагаецца за свой будынак мінская грамада «Новае жыццё». У 2006 г. у гэтай пратэстанцкай царкве адбылася самая масавая галадоўка, падчас якой вернікі патрабавалі абараніць свае правы перад Мінгарвыканкамам. Справа «Новага жыцця» дагэтуль застаецца не вырашанаю...*
**21:00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21:25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**22:00** Фільматэка майстроў: «Мілу ў траўні», маст. фільм, рэж. Люі Маль, 1990 г., Францыя—Італія.
*Бурлівы травень 1968 года. Не зважаючы на страйкі ды хваляванні ў Парыжы, сям'я збіраецца на пахаванне маці — уладальніцы вялікае сядзібы. Мілу, сын памерлай, усімі сіламі спрабуе захаваць маёнтак, які астатнія спадкаемцы хочуць прадаць...*





ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Мінску прайшла 33-я камбінаваная міліцэйская эстафета. Удзельнічалі прадстаўнікі ўсіх раённых упраўленняў унутраных справаў і іншых падраздзяленняў ГУУС Мінгарвыканкама, а таксама Унутраных войскаў. Не ўсе ўдзельнікі праніклісія абавязкам. Службовыя сабакі ленаваліся, таму міліцыянтам прыходзілася ім дапамагаць.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Агінскі ў мінулыя выходныя прымаў баль. Танцавалі, як звычайна, падэграс, галоп, польку-тройку, фігурныя вальсы і, канечне, той самы паланэз. Разгадвалі шарады, дамы гулялі ў карты, а мужчыны аддавалі перавагу шахматам. Напрыканцы вечара не абышлося без дуэлі. Так МГА «Гісторыка» ў Маладзечне адзначыла дзень народзінаў слыннага кампазітара і палітычнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага. На мэце было аднавіць атмасферу велікасвецкіх баляў XIX стагоддзя. Уласнаруч зробленыя строі, рэплікі ўдзельнікаў — усё адпавядала духу той эпохі. Была, была такою Беларусь…**

**Нобелеўскую прэмію міру ўпершыню далі не за справы, а за словы. Нарвежскі нобелеўскі камітэт ўганараваў Барака Абаму, які яшчэ і зрабіць нічога не паспеў на сваёй пасадзе. Палюбіўся чалавек еўрапейцам.**





PHOTO.BYMEDIA.NET

**Сталічная багема ніколі не спіць. На фота: паказ модаў маскоўскага мадэльера Валянціна Юдашкіна прайшоў у Палацы Рэспублікі 8 кастрычніка.**

## АНЕКДОТ

Пытанне армянскаму радыё:

— Скажыце, што гэта значыць, што Абаму далі Нобелеўскую прэмію міру?

— Памятаеце, як прэмію далі Гарбачову? Значыць, ЗША развáліцца.

***

Жонка: Для жанчыны святкаванне 40-годдзя заўсёды балючa.

Муж: Дык чаго ты святкуеш яго пяты год запар?

***

Мужчына прыходзіць на прыём да лекара:

— Доктар, я так моцна храпу, што буджу сябе самога.

— Дык якая праблема! Кладзіцеся ў суседнім пакоі.

## АНЕКДОТЫ З ЖЫЦЦЯ

Закон бумеранга.

Аднаго вяскоўца запрасіла сабутэльніца на дзень нараджэння. У кішэнях пуста, а культурна выпіць хочацца. Не разгубіўся. Надраў бярэмя кветак у суседскім гародчыку, пайшоў у госці.

Праз месяц вырашыў правіць уласны дзень народзінаў. З'явіліся грошы. Хапіла на пяць пляшак. Толькі гульнуць як след не ўдалося, бо ў хату набегла паўсельсавета. Усе з кветкамі.

***

Вярнуўся багаты дзядзька з замежнага курорта. Склікаў усіх сваякоў. Паказвае, выхваляючыся, фотаздымкі:

— Гэта — я ў рэстаране, гэта — я на пляжы, віно персікамі закусваю, гэта — за сталом, у госці нас запрасілі!

Няўдзячны пляменнік не падзяляе захаплення:

— Дзядзька, ты што, кабан? На кожнай фатаграфіі жарэш!

**Падслухала**
**Таццяна Барысік**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Сізінцава Арцёма** віншую з Днём народзінаў! Кахаю цябе, мілы! Марыля

### ПАДАРОЖЖЫ

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 1 лістапада па маршруце: Мінск—Лепель—Губін—Ула—Бачэйкава—Двор Нізгалава—Арэхаўна—Ушачы—Селішча—Мінск. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43

**Запрашаем** у падарожа «Замкі Беларусі» 25 кастрычніка (нядзеля) па маршруце: Мінск—Мір—Навагрудак—Любча—Шчорсы—Ліда—Іўе—Мінск. 18–22 лістапада: Прага—Дрэздэн. Т.: (017) 292-54-58, (029) 622-57-20, (029) 110-19-28, (029) 509-12-16

### ПАДЗЯКІ

**Кастусь Жукоўскі выказвае** шчырую падзяку сябрам КХП БНФ горада Гомеля і асабіста спадару Дзмітрыю Якаўцаву за падтрымку ў цяжкі час

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

Прошлага месяца бургамістр горада Прагі выдаў адозву да чэшскага грамадзянства, у каторай кажа, што праз гэты месяц на чэшскія нацыянальныя школы трэба зложыць паўмільёна рублёў. І... чэхі зложаць! Чэхі — народ светлы, народ свядомы, каторы разумее, што справа грамадская, справа нацыянальная — гэта таксама і справа кожнага грамадзяніна паасобку.

**«НН». №41. 1909**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6160. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.10.2009.
Замова № 5621.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12